№ 47 (357) 19 сьнежня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднworkoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



## Знайшлі пад елачкай

Садам Хусэйн.

старонка 2

## Сьвяты зь Вішнева

Гасьціны ў айца Чарняўскага.

старонка 11

## Адам Глёбус

Дык ты — мент?

старонка 15

### На партыйных франтах безь пераменаў

**Зьезды партыяў-антыподаў — Кампартыі Беларусі і Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ** — шматзначна супалі ў часе. Але першы адбыўся ў Доме вэтэранаў, другі — у лесе. **Старонка 3.**

### Нечаканкі не адбылося



**А.Лукашэнка прапанаваў кандыдатуру Сяргея Сідорскага на пасаду прэм'ер-міністра.** У пятніцу мае адбыцца галасаваньне. Абавязкі прэм'ера Сідорскі выконвае з 10 ліпеня.

### Які раскол?..



**«У Азэрбайджане сёньня пяць Народных Франтоў.** Мы падобнага не дапусьцім». Гутарка зь Вінцуком Вячоркам. **Старонка 6.**

### Калядны нумар «НН»

**Наступны нумар «НН» — Калядны, на 24 старонках.** Ён выйдзе ў пятніцу, 26 сьнежня. У нумары будуць падведзеныя вынікі году. Які год мы пражылі? Самыя значныя падзеі, самыя прыгожыя твары, найлепшыя кнігі, дыскі і фільмы. І як штогод, аматары сакавітага беларускага слова знойдуць у Калядным нумары «Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў». Сярод сёлетніх аўтараў — Уладзімер Арлоў, Рубэн Гальега Ганзалес, Джэці, Сяргей Астравец.

# Рэйтынг папулярнасьці палітыкаў

**На замову «НН» сацыялягічная служба «Люстэрка» інфармацыйнай кампаніі БелаПАН правяла зандаж грамадзкае думкі.**

### Лукашэнка падае

**Апытаньне пацьвердзіла, што адмоўны рэйтынг Лукашэнкі высокі.** Ён на 18 пунктаў перавышае ягоны станоўчы рэйтынг. З 24% галасоў пры закрытым пытаньні гэтая лічба зьніжаецца да 9% пры адкрытым пытаньні «За каго б Вы прагаласавалі, калі б прэзыдэнцкія выбары адбываліся сёньня?» ў паралельным апытаньні «Люстэрка». Прычым гэтага палітыка многія не прымаюць настолькі, што ў пяці анкетніках адкрытага апытаньня было напісана «Хто заўгодна, толькі не Лукашэнка».

### Давер да інтэлігенцыі

**Дзеля параўнаньня, да сьпісу палітыкаў мы дадалі некалькі эмблематычных грамадзкіх дзеячоў.** Вынікі ўзрушаюць. Аказалася, што людзі культуры выклікаюць нашмат большы давер грамадзтва, чым кадравыя палітыкі. Гэтак, 67-гадовы Генадзь Бураўкін на роўных змагаўся б з А.Лукашэнкам. У гэтым кантэксьце цікава, колькі ж грамадзкіх дзеячоў мы пабачым поруч з палітыкамі ў выбарчых сьпісах апазыцыі.

Трэба адзначыць, што ў апытальніках усе прозьвішчы, у тым ліку і кіраўнікоў партый, ішлі без пазнакі партыйнай прыналежнасьці.

Беларускую грамадзкую думку часта называюць ірацыянальнай і сьляпой. У тым, што гэта ня так, можа пераканацца лідэр «Зубра» Ўладзімер Кабец. Ён толькі нядаўна ўвайшоў у публічную палітыку, і ягонага прозьвішча проста ня ведаюць. Вось ён і набраў толькі галасы, якія можна характарызаваць як «супраць усіх» (а такіх, дарэчы, незвычайна шмат, каля пятае часткі).

### Эфэкт прысутнасьці

**З партыйных лідэраў новае хвалі найбольшую папулярнасьць у сталіцы мае старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка.** Гэта для кагосьці нечакана, але лёгка знаходзіць вытлумачэньне. Ён пасьлядоўны палітык, яго імя даўно на слыху, асацыюецца з найвядомейшай апазыцыйнай партыяй, не было зьвязана з скандаламі.

Апытаньне яшчэ раз пацьвердзіла, што толькі доўгія гады прысутнасьці на палітычнай арэне даюць пазнавальнасьць. Прынамсі, ва ўмовах недаразьвітасьці сыстэмы СМІ. Нягледзячы на год актыўнае дзейнасьці, не ўдалося стаць пэрсанальна вядомымі дэпутатам Фралову і Парфяновічу. І гэта ў сталіцы. У рэгіёнах, мусіць, справы стаяць яшчэ горш.

Тое самае можна сказаць і пра лукашэнкаўцаў (Папоў, Канаплёў, Касьцян), але гэтыя хлопцы ня ў Менску будуць выбірацца і не на вядомасьць разьлічваюць.

### Умацоўваюцца незалежніцкія настроі

**Якія шчэ тэндэнцыі ў грамадзкай думцы?** Сьведчаць іншыя вынікі, агучаныя службай «Люстэрка». Абсалютная большасьць жыхароў сталіцы па-ранейшаму выказваецца супраць зьменаў у Канстытуцыю, якія б дазволілі Лукашэнку абірацца на трэці тэрмін (51% супраць, 13% за). Адбыўся пералом і ў стаўленьні да інтэграцыі з Расеяй. Упершыню колькасьць прыхільнікаў незалежнасьці перавысіла колькасьць прыхільнікаў яднаньня з Расеяй (37% супраць 35%).

### Сыстэма пад пагрозай

**Няма ніводнага беларускага палітыка, чый станоўчы рэйтынг перавышаў бы нэгатыўны.** За мяжой такое немагчыма. Гэта знак поўнага няведаньня грамадзянамі палітыкаў, недаверу да іх і нецікавасьці імі, незалежна ад іх палітычнае масьці. Пры такой сытуацыі ўзьдзеяньне звонку, з Расеі, пры пэўных умовах пагражае дзейнай палітычнай сыстэме мэтамарфозамі ці нават крызысам.

Прычына такога становішча — несвабода СМІ. Практычна манаполія на інфармацыю — у руках дзяржавы. Пры гэтым несвабодныя ўрадавыя СМІ па вызначэньні не могуць забясьпечыць плюралізму, якасьці, цікавасьці інфармацыі. У выніку выбарцы татальна ня ведаюць і ня вераць. Прыбяры Лукашэнку — і зазьзяе пустка, што можа запоўніцца абы-кім.

**Мікола Бугай**

Калі б выбары адбываліся сёньня, Вы прагаласавалі б за ці супраць наступных палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў? (%)

| | за | супраць | ня ведаю |
|---|---|---|---|
| Аляксандар Лукашэнка | 24 | 42 | 34 |
| Генадзь Бураўкін | 17 | 18 | 65 |
| Станіслаў Шушкевіч | 12 | 36 | 52 |
| Зінаіда Бандарэнка | 11 | 23 | 66 |
| Уладзімер Арлоў | 10 | 18 | 72 |
| Вінцук Вячорка | 10 | 25 | 65 |
| Вадзім Папоў | 7 | 20 | 73 |
| Мікалай Статкевіч | 7 | 24 | 69 |
| Анатоль Лябедзька | 7 | 30 | 63 |
| Аляксандар Бухвостаў | 6 | 22 | 72 |
| Зянон Пазьняк | 6 | 45 | 49 |
| Аляксандар Дабравольскі | 5 | 19 | 76 |
| Уладзімер Канаплёў | 5 | 20 | 75 |
| Сяргей Калякін | 5 | 25 | 70 |
| Сяргей Гайдукевіч | 5 | 35 | 60 |
| Уладзімер Навасяд | 4 | 23 | 73 |
| Павал Севярынец | 4 | 25 | 71 |
| Андрэй Саньнікаў | 3 | 18 | 79 |
| Валеры Захарчанка | 3 | 19 | 78 |
| Уладзімер Парфяновіч | 3 | 20 | 77 |
| Валеры Фралоў | 3 | 21 | 76 |
| Ірына Красоўская | 3 | 20 | 77 |
| Сяргей Касьцян | 2 | 20 | 78 |
| Уладзімер Кабец | 1 | 20 | 79 |

Апытаньне прайшло 9—12 сьнежня ў Менску. Апытана 500 чалавек ад 18 гадоў і старэйшых. Выбарка квотная. Кантраляваныя парамэтры: пол, узрост, адукацыя. Памылка выбаркі ня большая за 1%.

«НН» мяркуе абнаўляць такі рэйтынг рэгулярна. А ў Калядным нумары «НН» будуць апублікаваныя вынікі апытаньня аб ідэалягічных сымпатыях жыхароў сталіцы.

### «Сьвяты Вечар» сёньня

**Сёньня, у чацьвер, а 19-й, у канцэртнай залі «Менск» вялікае калядное шоў «Сьвяты Вечар» з удзелам Вольскага, Вайцюшкевіча, Памідорава, Кругловай.**



## Апошні тыдзень падпіскі

Падпісацца на «НН» можна на любой пошце. У Менску таксама прымаецца **падпіска на шапікі «Белсаюздруку»** або праз прыватныя сыстэмы дастаўкі **«Эй Бі ПрэсСэрвіс»** і **«Рэм-Інфо»**. «Наша Ніва» ў 2004 г. застанецца надзейнай крыніцай інфармацыі і грунтоўным аналітыкам беларускага і міжнароднага жыцьця. У праектах — рост газэты да 24 старонак у тыдзень. Адзіная цалкам беларускамоўная агульнанацыянальная газэта, «Наша Ніва» адстойвае беларускія нацыянальныя інтарэсы, прынцыпова трымаецца незалежнасьці ад уладаў і палітычных сілаў. **Дык падпісвайся!** Падпіску на другое паўгодзьдзе прымаюць да 24 сьнежня. Цана падпіскі на месяц праз «Белпошту» складае 2150 рублёў, для менчукоў на шапік «Саюздруку» 1500 рублёў. Сьпіс шапікаў друкуецца на старонцы 5.

## Дзень «Пабеды»

**У суботу ў Менску адзначылі дзень народзінаў аўтамабіля. «Пабедзе» Якуба Коласа стукнула 50 гадоў. Старонка 7.**



## Івашкевіч на волі

**Віктар Івашкевіч выйшаў на волю 16 сьнежня а 7.30 раніцы.** Ён павінен быў вызваліцца толькі а 14-й, але кіраўніцтва «хіміі» пабаялася шматлюднай сустрэчы й узьняла рэдактара «Рабочага» раным рана ды тэрмінова вызваліла. За Івашкевічам прыехаў Генадзь Быкаў: «Некалі яго прывёз сюды й адсюль павінен вывезьці». На разьвітальную вячэру на ўправе БНФ сабраўся ўвесь грамадзкі бамонд Баранавіч. Сьпявалі беларускія песьні. Спадар Віктар абяцаў вярнуцца сюды кандыдатам у дэпутаты. Адна толькі «хімія» дасьць яму 150 галасоў.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Як украсьці 200 тысяч

**Марыя Дзялун, дырэктарка прыватнае галерэі «Штандарт», асуджаная на дзевяць гадоў турмы з канфіскацыяй за махлярства.** Яна зьбірала грошы на «выратаваньне» «Габэлену стагодзьдзя» — палатна 14 на 19 м. Пазычаныя пад вялікі працэнт 250 тыс. даляраў зьніклі ў невядомым кірунку. «Ратаваць» твор, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэсу, Дзялун зьбіралася шляхам яго продажу на заходнім аўкцыёне. Хоць габэлен прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасьцю дзяржавы і вывозіць яго за мяжу забаронена.

**СМ**

## «Ніца або сьмерць»

**«Ніца або сьмерць» — гэты лёзунг стаў папулярны ў Польшчы напярэдадні Брусэльскага саміту Эўразьвязу.** Палякі заявілі, што не пагодзяцца на зьмену сыстэмы галасаваньня ў Эўразьвязе, ухваленую тры гады таму ў Ніцы. Паводле гэтай сыстэмы, Польшча, як і Гішпанія, мела б у Эўрапарлямэнце 27 галасоў, а, прыкладам, Нямеччына — 29. Бэрлін кажа, што гэта несправядліва: у Гішпаніі і Польшчы жывуць разам 80 млн чалавек, і краіны маюць разам 54 галасы, а ў Нямеччыне — 82 млн, а галасоў усяго 29. Нямеччына і Францыя, подпісы якіх стаяць пад Ніцкім трактатам, хочуць таксама, каб рашэньні ў Радзе прымаліся, калі за іх прагаласуюць краіны, дзе жыве больш за 60% насельнікаў Зьвязу. Гэта дазволіла б Бэрліну і Парыжу пры дапамозе Рыму і Лёндану праводзіць любыя рашэньні для сябе рашэньні.

З прычыны розьніцы ў поглядах праект новай канстытуцыі ЭЗ, у якім прадугледжаная і новая сыстэма галасаваньня, ня быў ухвалены ў Брусэлі. Эўрапалітыкі сцьвярджалі, што тут няма нічога страшнага. Аднак на тыдні шэсьць самых заможных краінаў ЭЗ заявілі, што хочуць абмежаваць свае ўнёскі ў агульнаэўрапейскі бюджэт. Гэта ўдар па новых сябрах ЭЗ, перадусім па Польшчы, якая да 2013 г. мелася атрымаць з эўрабюджэту 100 млрд эўра датацый. Назіральнікі кажуць, што гэта помста менавіта за пазыцыю Варшавы.

Але Польшча не зьбіраецца зьмяняць сваю пазыцыю ў справе сыстэмы галасаваньня. «Мы мелі рацыю, калі змагаліся за незалежнасьць, змагаліся з камунізмам. Маем яе і цяпер», — сказаў прэзыдэнт Квасьнеўскі. На прыняцьце новай Канстытуцыі Эўропа яшчэ мае час. Цяперашні Ніцкі трактат будзе дзейнічаць да канца 2008 г., і пашырэньне ў наступным годзе адбудзецца на падставе менавіта гэтага дакумэнту.

**Аляксей Дзікавіцкі, Варшава**

## Кучма лезе пішчом

**Леанід Кучма дабіўся згоды Канстытуцыйнага суду на перадачу парлямэнту права абіраць прэзыдэнта.** Кучма ня мае права балятавацца на трэці тэрмін, а перадача ўлады парлямэнту дазволіла б алігархам захаваць кантроль над краінай. Тым часам правацэнтрысцкі блёк «Наша Ўкраіна» за месяц сабраў больш за тры мільёны подпісаў у падтрымку ўсеагульных выбараў прэзыдэнта.

**МБ**

# «Цуд» пад Каляды


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Незавершаны будынак ірацкага пасольства выстаўлены на продаж. Будынак агульнай плошчай амаль 2,5 тысячы квадратных мэтраў з падземнымі гаражамі на 6 машынаў разьмешчаны ў гістарычным цэнтры Менску, на Шпалернай. За яго просяць 1,5 мільёна даляраў.

Выбітная навіна на мінулыя выходныя напаткала аматараў канапнага паляваньня ў тэлеэтэры. Каб даць спажыву бясконцым размовам на ўвесь працоўны тыдзень. Князь цемры, сатрап Бабілёну, Садам Хусэйн трапіў у палон.

Але аматары жанру экшэн мелі права быць расчараванымі. Ніякіх каўбойскіх пагоняў, ніякіх гарачых перастрэлак, ніякіх драматычных дыялёгаў. Не было нават галоўнага героя гэтае шматсэрыйнае драмы, за лёсам якога сачылі гадамі. Была няясная карцінка, на якой калматага чалавека мацалі лекары ў бялюткіх гумовых пальчатках. Сюжэт хутчэй з каналу «Animal planet». Як там з Жэнэўскай канвэнцыяй? Яна яшчэ забараняе паказваць палонных на экране? Ці яна толькі для белых?

Няўцямнымі былі й камэнтары да тае няўцямнае карцінкі на экране. То казалі, што нікога пры Садаму не было, усе, маўляў, паўцякалі. Пасьля высьветлілася, што злапалі двух ягоных памагатых. Але чаму яны не давалі свайму правадыру есьці? То казалі, што пры Хусэйну знайшлі аўтамат Калашнікава, то толькі пісталет. То нібы пры ім быў чамадан баксаў, то не пры ім, а ў нейкай таксоўцы (!?) побач (?!).

І галоўнае: Садама злавілі самі амэрыканцы, без дапамогі курдаў ды ірацкіх паліцыянтаў, як пра тое паведамлялася раней. А вось гэтая акалічнасьць прымушае засумнявацца ва ўсёй інфармацыйнай нагодзе. Паколькі сьведкаў, апроч амэрыканскіх спэцназаўцаў, няма, то й уся інфармацыя зь іхных вуснаў можа быць недакладнай. Хто перакана́ўча давядзе, што Садама зьлавілі менавіта ў тую суботу, а не, напрыклад, зь месяц таму? Апэратыўных кадраў затрыманьня багдадзкага дыктатара не паказвалі. А лезьці яму пальцамі ў рот і чухаць патлы маглі і ў Гуантанама. Дый чамадан з амэрыканскімі грашыма, за які Садам нібы трымаўся да апошняга моманту, мог узяцца адкуль заўгодна. Таму, хто цікавіўся забойствам Кенэдзі альбо проста знаёмы з тэлевізійнымі тэхналёгіямі, усё, што падаецца ў дазаваным варыянце з вуснаў зацікаўленых асобаў, можа падацца непераканаўчым.

Зрэшты, ня так гэта істотна. У суботу злавілі Садама ці не, з даляламі ці з залатым пяском, ці быў пры ім «калашнікаў» або «макараў». Факт — амэрыканцы прапануюць нам яшчэ адзін хэпі-энд яшчэ адной чыста амэрыканскай гісторыі. А ў амэрыканскіх гісторыях заўсёды перамагаюць зухі-амэрыканцы. Пажадана на выходныя і пажадана перад Калядамі. Каб усе калядныя вакацыі можна было цешыцца зь перамогі амэрыканскага дабра й справядлівасьці над сіламі цемры. Ну, і хваліць сваё, амэрыканскае начальства.

Зрэшты, і гэта неістотна. Істотна тое, што ў сьвеце засталося толькі некалькі рэжымаў, зь якімі могуць быць сур'ёзныя праблемы. На адным на кожным кантыненце. У Амэрыцы — Куба, у Афрыцы — Зымбабвэ, у Азіі — Карэя, у Эўропе... І гэтак далей. Калі б такіх краінаў не было (а досьвед Іраку паказвае, што можна перавярнуць любы рэжым даволі лёгка), не было б і драматычнай гульні, што завецца барацьбой за дэмакратыю. Сьвет стаў бы аднолькавым і нецікавым. Барацьба дабра і зла зьвялася б да біржавых навінаў.

Зрэшты, і гэта для нас неістотна. Істотна, што беларускі лідэр чарговы раз памыліўся з сваімі геапалітычнымі прагнозамі што да Іраку — як і да Грузіі, і да Югаславіі, і г.д. Выдаючы жаданае за сапраўднае, дэманструючы глябальнасьць свайго мысьленьня, ён чарговы раз трапляе не туды.

Пакрысе таюць ілюзіі адносна інвэстыцыяў ад сумнеўных рэжымаў на Ўсходзе. Помнікам той пары, калі яны былі, можа застацца вялікі будынак недабудаванай амбасады Іраку на менскай вуліцы Шпалернай. З будаўнічага плоту, што акаляе гэты гмах у маўрытанскім стылі, ціхамоць прыбралі й шыльду з ганарлівым назовам аб'екту будоўлі.

Куды больш істотна для нас тое, што мы ведаем амаль усё пра Садама Хусэйна. Хто ягоны бацька, хто дзядзька. Дзе вучыўся, з кім аджаніўся. Ведаем, што ягоны ўлюбёны гістарычны пэрсанаж — Сталін, любімы кінафільм — «Хросны бацька» Марціна Скарсэзэ, любімая кніга — «Стары і мора» Хэмінгуэя. Пра былога ірацкага сатрапа мы ведаем амаль усё, а пра Лукашэнку амаль нічога... Пакуль што.

**Гары Куманецкі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Канстытуцыйны суд у абарону беларускамоўных

**У абарону беларускамоўных грамадзянаў Беларусі выступіў Канстытуцыйны суд.** Ён накіраваў у палату прадстаўнікоў зварот аб неабходнасьці раўнапраўя беларускай і расейскай моваў «у сфэры абслугоўваньня, абарачэньня банкаўскіх плястыкавых картак і ў сыстэме дзяржаўнага сацыяльнага страхаваньня». У звароце гаворыцца пра фактычную няроўнасьць моваў у згаданых сфэрах. Канстытуцыйны суд прапануе зьмяніць законы так, каб роўнасьць моваў стала не дэкляраванай, а фактычнай. Нагадаем, што ўлетку суд ужо прыняў рашэньне пра абавязковасьць беларускамоўнага стандарту для этыкетак.

Ці ў Беларусі існуе дыскрымінацыя паводле моўнае прыкметы? Палітоляг Алесь Лагвінец кажа, што так. І штодзень: «Ніводнай беларускамоўнай FM-станцыі, ніводнага беларускамоўнага тэлеканалу. Няма для школаў ні картаў, ні схемаў, ні табліцаў па-беларуску. У войску, міліцыі беларускамоўных прымушаюць адказваць па-расейску. Судзьдзі ня ўмеюць весьці па-беларуску працэс і наагул справаводзтва». Суды (справы Ўладзімера Лабковіча, Вольфа Рубінчыка летась) нават не дазваляюць карыстацца перакладчыкам на судзе.

А.Лагвінец мяркуе, што гэтыя пастановы найвышэйшага суду краіны юрыдычна здаровыя: «У кожнай полілінгвістычнай краіне гэта было б нармальна. Грамадзянін не павінен нават даказваць, што ён ня ведае іншай мовы, ён проста мае права, каб яго абслугоўвалі на пажаданай яму дзяржаўнай мове».

**Аркадзь Шанскі**

## Падпіска на 12 гадоў

Што рабіць, калі Вы ад'яжджаеце на паўгоду, а хочаце не прапусьціць камплекту «НН»? Што рабіць, калі Вы не давяраеце дзяржаўнай сыстэме дастаўкі? Калі хочаце падпісацца адразу на некалькі гадоў?

Незвычайныя паслугі падпісчыкам прапануе прыватная служба дастаўкі прэсы. У прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс» падпісная цана «НН» на паўгоду складае: для ведамасных падпісчыкаў 17885 руб. з ПДВ, для індывідуальных падпісчыкаў 15426 руб. Газэта дастаўляецца кур'ерам з рук у рукі. Падпіска прымаецца на любы пэрыяд праз т.: 223-44-52, 226-87-99, 222-27-20.



## Нашаніўскі навагодні ранішнік

**ВМА-group і «Наша Ніва» прэзэнтуюць! У час зімовых канікулаў, 2 студзеня, у Палацы культуры вэтэранаў пройдзе беларускі ранішнік «Навагодні акіян радасьці».** Пацешце сваіх дзетак. У праграме — дзіцячы спэктакль, дыскатэка з гульнямі, конкурсамі й падарункамі каля елкі. Пачатак а 12-й. Цана квітка 2500—3000.

# У гушчарах

## Пазьняк крытыкуе і «імпэрыялістычную Расею», і «выраджэнскую Эўропу»

**Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ свой зьезд ладзіла ў лесе пад Менскам. Паўтары сотні дэлегатаў з усёй краіны і некалькі журналістаў былі прывезеныя на аўтобусах у адзін з дамоў адпачынку. Канспірацыя была дасканалаю. Нават некаторыя сябры Сойму партыі ня ведалі месца правядзеньня зьезду.**

Яго аддаленасьць ад сталіцы гарантавала прысутнасьць дэлегатаў аж да заканчэньня зьезду, чаго, напрыклад, не ўдалося дасягнуць камуністам з КПБ — у іх некаторыя таварышы паўцякалі яшчэ перад абедам.

Старшыня партыі на зьезьдзе прысутнічаў віртуальна, што сталася ўжо традыцыяй. Тэлемосту «Менск—Варшава» не было. Выступ З.Пазьняка паўгадзіны нуднавата чытаў сп.Крыжаноўскі. Рэзала вуха бясконцае паўтарэньне розных варыяцыяў з словамі «гэбэ» і «гэбізм». Месцамі даклад быў даволі жорсткі: «Расейскі імпэрыялізм ёсьць бязьлітасным і вечным ворагам Беларусі і беларускай нацыі. Беларусам гэта трэба напісаць чырвонымі літарамі на лбе, калі толькі яны хочуць выжыць, зьберагчы сваю Бацькаўшчыну і дзяржаву». І яшчэ: «У сыстэме лібэральнай эканомікі збачэнства ўзьведзена ў бізнэс, стала таварам».

Паводле Пазьняка, Беларусі чужыя і «левалібэральная Эўропа», і «гэбоўская Расея»: «Мы іншыя эўрапейцы, бо не згубілі душы». Ён кажа, што добрай альтэрнатывай і Эўразьвязу, і Расеі магла б быць Балтыйска-Чарнаморская садружнасьць — ідэя, што так і не была рэалізаваная. Перад КХП-БНФ ставіцца задача «любой цаной не дапусьціць страты незалежнасьці нашай краіны, зьберагчы мову, культуру, працу і маёмасьць Беларусі шляхам ліквідацыі нелегітымнай прамаскоўскай улады». Цяпер ёсьць некалькі месяцаў перадышкі — да прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі, лічыць З.Пазьняк. А пасьля пойдзе чарговы наступ Расеі на Беларусь. Паводле Пазьняка, «кіраваная апазыцыя» абедзьвюх кааліцыяў, калі пойдзе на выбары (рэфэрэндум), будзе залічаная да «калябарантаў і здраднікаў радзімы». Такім чынам, КХП-БНФ фактычна застаецца сам-насам з расейскім імпэрыялізмам і аб'яднанай Эўропай, Гансам Вікам і амэрыканскімі дэмакратамі, «каляніяльнай адміністрацыяй» і левалібэраламі-выраджэнцамі. Але ці хопіць сваіх сілаў выстаяць? Бо і само кіраўніцтва партыі прызнае, што КХП-БНФ сёньня, акрамя ўсяго іншага, не хапае людзей.

Юры Беленькі падтрымаў Пазьняка ў тым, што ў Беларусі існуе канфлікт не паміж Лукашэнкам і беларускімі сіламі, а паміж апошнімі і расейскім імпэрыялізмам, а ўлада Лукашэнкі — гэта «каляніяльная адміністрацыя».

Яшчэ адзін намесьнік старшыні і адказны сакратар управы КХП-БНФ Сяргей Папкоў гаварыў пра «велізарныя посьпехі». Паводле яго, менавіта дзякуючы кансэрватарам і іх ахвярнай працы не адбыўся ўвосень 2003-га рэфэрэндум.

Неспадзяванак на зьезьдзе не было. Не было і спробаў «раскалоць» партыю, можна згадаць хіба некалькі крытычных, але карэктных выступаў дэлегатаў у адрас намесьнікаў старшыні. Сп.Папкоў абвесьціў, што некалькі актывістаў партыі папрасілі пазбавіць іх ад пасадаў, бо вырашылі «рабіць кар'еру» (тут найперш меліся на ўвазе Анатоль Крыварот і Валянціна Мароз). Аднагалосна старшынём партыі былі пераабраны Зянон Пазьняк, а ягонымі намесьнікамі (іх цяпер будзе толькі два) — Юры Беленькі і Сяргей Папкоў.

Былы ж намесьнік старшыні КХП-БНФ Уладзімер Старчанка ў сваім выступе наракаў на адсутнасьць у партыі рэсурсаў, матэрыяльна-тэхнічнай базы. Ён, як адказны за інфармацыйную палітыку, спрабаваў стварыць партыйнае інтэрнэт-радыё, каб «людзі маглі пачуць голас Зянона Пазьняка», але не атрымаў у яго на гэта згоды. А вось партыйны сайт, паводле Старчанкі, вельмі папулярны і апярэджвае па папулярнасьці аналягічныя інтэрнэт-рэсурсы. Старчанка заклікаў дэлегатаў устрымацца ад дыскусіяў альбо нават і расколаў: «Нашая арганізацыя па факту належыць Зянону Станіслававічу Пазьняку і можа толькі ім кіравацца».

**Сяргей Ёрш**




**Кансэрватары ўзмацняюць крытыку і «левалібэральнай Эўропы», і «гэбоўскай Расеі»: «Мы іншыя эўрапейцы, бо не згубілі душы».**

# Сьпірытычныя сэансы камуністаў

## У КПБ толькі 200 камуністаў, маладзейшых за трыццаць гадоў

**Камуністы з КПБ сабраліся на свой зьезд у сталічным Доме вэтэранаў. Асаблівая ўвага была зьвернутая на прапускны рэжым. На ўваходах у залю паседжаньняў стаялі групы дружыньнікаў з чырвонымі павязкамі, якія правяралі дакумэнты дэлегатаў і гасьцей, бо мелі інструкцыю не прапусьціць «якога-небудзь бээнэфаўца». Аднак ніякіх інцыдэнтаў ня здарылася.**

Аднымі з галоўных прамоўцаў на зьезьдзе былі таварышы... Ленін і Сталін. Фанаграмы з іх выступамі камуністы віталі, пляскаючы ў далоні. Гэтыя «сьпірытычныя сэансы» па выкліку духаў камуністычных правадыроў ажывілі хаду зьезду: выступы іх ідэйных пасьлядоўнікаў былі нашмат нуднейшымі. Хіба толькі павесяліў кіраўнік берасьцейскіх камуністаў вэтэран Васіль Марозаў, які паведаміў, што на ўсходнім беразе Бугу ён «чуе дух NATO»...

У справаздачным дакладзе першы сакратар партыі дэпутат Валеры Захарчанка (ён быў пераабраны і на наступны тэрмін) акрэсьліў галоўную задачу КПБ на сёньняшнім этапе: усімі сіламі спрыяць стабільнасьці дзяржавы і палітычнаму курсу прэзыдэнта. КПБ, як праўрадавая партыя, імкнецца таксама паўлічыць сваё прадстаўніцтва ў органах улады і кіраваньня. Яна мае сваю групу «Народны дэпутат» у палаце прадстаўнікоў, якая складаецца з 18 чалавек, яшчэ каля 200 камуністаў зьяўляюцца дэпутатамі мясцовых саветаў. Паводле нашай інфармацыі, КПБ цяпер зьбіраецца аб'яднаць у групу «Народны дэпутат» усіх сваіх народных абраньнікаў. Прынамсі, на зьезьдзе сярод дэпутатаў зьбіраліся заявы на ўступленьне.

Шмат увагі ў дакладзе В.Захарчанкі было нададзена апазыцыі. Маўляў, у краіне «сфармавалася цэлая армія апазыцыянэраў розных масьцей», якая, нягледзячы на паразы, «захоўвае дастаткова магутны патэнцыял» і аб'ядноўваецца «ў розныя групы». Акрамя таго, «некаторыя апазыцыянэры падтрымліваюцца нават прадстаўнікамі ўладных структураў Расеі». Найбольш дасталося канкурэнтам з ПКБ, якіх называлі «калектыўным папом Гапонам», «правакатарамі», «здраднікамі». А Сяргей Калякін, паводле Захарчанкі, ня толькі «цягне партыю ў абдымкі правых», але і «ўводзіць у зман грамадзянаў краіны».

Гаворачы пра міжнародную сытуацыю, на зьезьдзе адзначалі, што «палітычнае напружаньне вакол нашай Рэспублікі можа ўзмацніцца», напрыклад увосень 2004 г., падчас выбараў у палату прадстаўнікоў. Камуністы папярэджваюць пра небясьпеку паўтарэньня ў Беларусі «югаслаўска-грузінскага варыянту».

Кіраўніцтва партыі заклікала сваіх сяброў заваёўваць Інтэрнэт, стварыць сайт, умацоўваць прафэсійнымі кадрамі тыднёвік «Коммунист Белоруссии. Мы и время». КПБ зьбіраецца ў бліжэйшы час распачаць выданьне газэты «Правда в Белоруссии». Вялікія сілы будуць кінутыя на залучэньне ў партыйныя шэрагі моладзі, стварэньне моладзевай сэкцыі. Пакуль у КПБ налічваецца толькі 200 камуністаў, маладзейшых за трыццаць.

На зьезьдзе адзначалася «раскольніцкая дзейнасьць групы Школьнікава», якая «хацела ўцягнуць КПБ у саюзную арганізацыю». Зрабіць ёй гэта не ўдалося, але небясьпека засталася, прызнаваў Валеры Захарчанка. А вось баранавіцкія камуністы прапанавалі аб'яднацца з кампартыяй Расеі, але ім растлумачылі, што «сёньня мы жывём у розных дзяржавах і вымушаныя працаваць у іх прававых палях».

На зьезьдзе камуністаў прысутнічалі прадстаўнікі «брацкіх партыяў» з Расеі, Украіны, Віетнаму, паслы-камуністы з Малдовы, Кубы, супрацоўнік амбасады Кітаю, прадстаўнік Прыднястроўя. У прэзыдыюме засядалі таварышы Сакалоў і Малафееў. Расейскі камуністычны функцыянэр Валянцін Раманаў распавядаў «жахі» пра сытуацыю ў Расеі, дзе, аказваецца, пасьля выбараў адбылася «канцэнтрацыя ўлады ў руках аднаго чалавека». Але беларускія камуністы ўспрынялі паведамленьне Раманава абыякава: у Беларусі гэтым нікога ня зьдзівіш.

**СЁ**




**Валеры Захарчанка служыць справе Леніна і Лукашэнкі.**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Ліміт росту цэнаў вычарпаны

**Урад і Нацбанк ня здолелі ўтрымаць інфляцыю нават у прагнозных рамках.** За 11 месяцаў году цэны вырасьлі на 24%. Гэта болей, чым разьлічвалася на цэлы год. Беларусь — краіна з найвышэйшым узроўнем інфляцыі ва Ўсходняй Эўропе.

### Валютныя запасы Беларусі растуць

**На 1 лістапада памер чыстых актываў ураду і Нацбанку краіны складаў 500,6 млн даляраў,** што на 4,5% болей проці пачатку году.

### Рост цэнаў на дрэва й дровы

**З 1 студзеня зраўняюцца цэны на дзелавую драўніну, прызначаную на экспарт, і драўніну дзеля ўнутранага карыстаньня.** Увогуле кошт драўніны вырасьце ў паўтара разу. Фіксаваная цана складамэтра расьпілаваных дроваў павысіцца з 3,5 да 4,5 тыс. руб. Норма на адну хату — 7 складамэтраў. Звыш гэтага ліміту дровы прадаюцца па свабоднай цане.

### Ультыматум Касьянава

**Выступаючы ў Кіёта, расейскі прэм'ер Міхаіл Касьянаў публічна выставіў Беларусі ультыматум.** Калі да 1 студзеня Расея й Беларусь не дасягнуць згоды па стварэньні газатранспартнай кампаніі, з Новага году Беларусь будзе атрымліваць газ з Расеі па 50 даляраў за тысячу кубамэтраў.

### Палічылася з «Балтыкай»

**Пазыку «Балтыцы» ў 10,5 млн даляраў «Крыніца» выплаціла за два дні да разбору ў Краснадарскім арбітражным судзе ў справе арышту маёмасьці беларускага заводу.** Расейскія інвэстары лічаць, што ім павінны выплаціць яшчэ й працэнты. Тым часам беларускаму ўраду пад націскам Масквы давялося скасаваць уласнае рашэньне аб спагнаньні ПДВ на транзыт расейскіх тавараў.

### Даляр застанецца слабым проці эўра

**Арышт Садама наўрад ці выкліча моцнае падзеньне цэнаў на нафту і рост курсу даляра, мяркуе большасьць экспэртаў.** Рэзкі пералом сытуацыі можа адбыцца толькі ў тым выпадку, калі амэрыканцы знойдуць бэн Ладэна. Замежнагандлёвы дэфіцыт у ЗША застаецца рэкордна высокім. У кастрычніку ён склаў $41,77 млрд проці $41,34 млрд у верасьні.

### Піва: у Нямеччыне меней, у нас болей

**Паводле ацэнак аналітыкаў агенцтва «Fitch», рынак піва ў Заходняй Эўропе працягвае курчыцца.** З усіх краінаў толькі ў Італіі і Гішпаніі продажы ў апошнія пяць гадоў расьлі. А ў Нямеччыне, напрыклад, яны зьменшаліся на 1,5% за год. Тым часам ва Ўсходняй Эўропе, у тым ліку й Беларусі, спажываньне піва расьце на 5—10% у год, за кошт выцісканьня мацнейшых напояў.

**МБ; БелаПАН**

# Сацыяльны, але

**Дзяржбюджэт на 2004 г. будзе балянсаваць на хісткім замежным гандлі, кіне трыльён у стратны аграпрамкомплекс, ускладніць умовы для прыватнага прадпрымальніцтва. Адначасова ў яго закладзеныя найбольшыя за чатыры гады выдаткі на заробкі бюджэтнікам, сацыяльныя патрэбы, жыльлёвае будаўніцтва. Бюджэт-2004 для «НН» аналізуе эканаміст Уладзімер Валетка.**

У 2004 г. даходы кансалідаванага бюджэту Беларусі прагназуюцца ў памерах 19 трлн руб., што складзе 42,1% валавога ўнутранага прадукту краіны. Расходы кансалідаванага бюджэту складуць 19,7 трлн руб. Бюджэт, такім чынам, будзе дэфіцытным: расходы на 690,2 млрд руб. перавысяць прыбыткі. На шчасьце, нарэшце з крыніцаў фінансаваньня дэфіцыту бюджэту выключаная эмісія Нацбанку, якая штогод спрычынялася да росту інфляцыі ў краіне.

### Ненадзейны замежны гандаль

Лічба росту ВУП, памер якога зьяўляецца асновай плянаваньня даходаў бюджэту, выклікае сумневы. Гэта пацьвярджаецца і структурай даходаў бюджэту: пры росьце даходаў дзяржавы на 10% удзельная вага падаткаў на прыбытак і даходы, наадварот, плянуецца меншай. Цяжка лічыць рэалістычным і тое, што 65% дэфіцыту бюджэту (451,7 млрд руб.) будзе прафінансавана з-за мяжы. Гэтыя сумневы пацьвярджае досьвед пакрыцьця дэфіцыту ў 2002 г., калі па артыкуле «Іншыя крыніцы замежнага фінансаваньня», заплянаваным у памеры 161,4 млрд руб., было атрымана ўсяго 5,7% ад сумы.

Разьлік на паступленьні ад замежных крыніцаў характэрны і для плянаваньня прыбыткаў бюджэту. Кампэнсацыя зьмяншэньне збораў ад ПДВ пакліканы рост даходаў ад замежнага гандлю, доля якіх мае ўзрасьці на 5%. Але большасьць мытных даходаў усё ж залежыць ад канкурэнтаздольнасьці айчынных тавараў на замежных рынках, якая яшчэ вельмі далёкая ад стабільнасьці. А з другога паўгодзьдзя 2004 г. Беларусь пачне жорстка фіксаваць абменны курс у адносінах да расейскага рубля, які ўжо ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве мае ўсе падставы для ўзмацненьня з 30 да 15—17 RUB/USD. У расейскім Мінфіне ўвогуле лічаць, што рэальны курс — 11 RUB/USD. Калі працэс «адпусканьня» расейскага рубля пачнецца ўжо налета, дык прывязаны да яго беларускі рубель будзе таксама прапарцыйна даражэць. І беларускія тавары пачнуць даражэць у замежнай валюце. А па-за СНД ужо цяпер пастаўляецца 46% экспарту. Адначасова прывязка да расейскае валюты пазбавіць Нацбанк магчымасьці праз абясцэньваньне беларускага рубля падтрымліваць рост экспарту ў Расею (за кошт дэвальвацыі беларускія тавары сёлета рэальна патаньнелі на расейскім рынку на 4%). Такім чынам, стабільнасьць такой крыніцы даходаў бюджэту 2004 г., як замежны гандаль, — пад пытаньнем.

### Ненаедны АПК

Структура даходаў бюджэту абвяргае і дэкляраванае дзяржавай паніжэньне бюракратычнага ўціску. Аб гэтым сьведчыць заплянаваны рост непадатковых даходаў, у тым ліку за кошт адміністрацыйных збораў, якія разам з узрослымі паступленьнямі ад ліцэнзаваньня і рэгістрацыі дадуць каля 3% даходу бюджэту.

Аднак найбольшым расчараваньнем сталася захаваньне на ўзроўні 2% збораў з выручкі на падтрымку АПК. Паменшылі толькі зборы на ўтрыманьне і рамонт жыльлёвага фонду (з 1% да 0,75% ад выручкі) і ў жыльлёва-інвэстыцыйныя фонды (з 0,5% да 0,4%). Памяншэньне збораў для АПК на 0,5% магло б панізіць падатковую нагрузку на прадпрыемствы. Аднак аграрнае лобі адстаяла свае 0,5% — ці 247 млрд руб. Усяго ж з прадпрыемстваў іншых галінаў (а дакладней, з кішэняў спажыўцоў, якія вымушаныя набываць даражэйшую прадукцыю) на карысьць АПК толькі ў выглядзе гэтага збору плянуецца адабраць без малога трыльён — 988 млрд руб.

АПК патрабуе грошай не на развіцьцё, а ў асноўным на аплату таго, што ўжо «праеў» у мінулым. На аплату «запазычанасьцяў мінулых гадоў» пойдзе 434,5 млрд руб. У 2002 г. памер толькі простых датацыяў АПК склаў 32% ад выпуску галіны (згодна з патрабаваньнямі Сусьветнае гандлёвае арганізацыі датацыі сельскай гаспадарцы не павінны перавышаць 10% ад выпуску). А калі ўлічыць ускоснае «напружваньне» эканомікі? І на гэта маўкліва згаджаюцца прадстаўнікі прамысловасьці, на якую, разам з будаўніцтвам, прыпадае найбольшы цяжар падаткаў.

Што дае АПК бюджэту? Калі ня ўлічваць таго, што калгасы часткова падтрымліваюць сельскую інфраструктуру, дык летась аграпрамкомплекс даў 1,8% даходаў бюджэту ў выглядзе падаткаў і іншых плацяжоў. А плянуе забраць 988 млрд руб. (11,7% ад расходаў бюджэту — гл. табліцу) ды плюс яшчэ 165 млрд руб. (1,9%) па асобным артыкуле «Сельская гаспадарка». Усяго — 13,6%. Аб якой збалянсаванасьці бюджэту можа ісьці размова?

### Пажаданая інфляцыя і апэратыўныя патрэбы

Як пазначаецца ў нататцы да бюджэту, удзельная вага расходаў на сацыяльна-культурную сфэру, субсыдыі ЖКГ, датацыі на будаўніцтва жытла, кампэнсацыі і льготы складзе 67,1% у параўнаньні з 65% у 2001—2003 г. З сумы сацыяльных выдаткаў на заробкі бюджэтнікаў прыпадзе 41% (з адлічэньнямі), а разам з пэнсіямі, дапамогамі і стыпэндыямі — 48%. Як і раней, бюджэт прэтэндуе на сацыяльную накіраванасьць.

Аднак ёсьць некалькі момантаў, якія ставяць аптымізм аўтараў бюджэтнай нататкі пад пытаньне. Так, расходы кансалідаванага бюджэту

> У 2001 годзе мінімальны спажывецкі бюджэт складаў 58 даляраў. У 2003 годзе ён вырас ужо да 82 USD. За 2,5 году пакупніцкая здольнасьць даляра ў Беларусі панізілася амаль на 42%.

павінны вырасьці адносна 2003 г. на 17,3% пры заплянаванай інфляцыі 14—18%. Нават пры знаходжаньні інфляцыі ў межах прагнозу (18%) паступленьні зь бюджэту ў рэальным выражэньні могуць быць меншымі, чым у 2003 г.

У 2004 г. фінансавыя органы зноў захаваюць рычагі скажэньня заплянаваных выдаткаў у адпаведнасьці з «апэратыўнымі» (пралабіраванымі) патрэбамі. Бо пры наяўнасьці інфляцыйных і іншых незаплянаваных даходаў бюджэту (у 2002 г. праз гэта было сабрана на 15% больш даходаў, чым прагназавалася) фінансаваньне асобных артыкулаў нават у межах плянавых лічбаў будзе азначаць іх рэальнае недафінансаваньне. Так, у 2002 г. «непрыярытэтнымі» кірункамі фінансаваньня сталіся артыкулы «Разьвіцьцё рынкавай інфраструктуры», «Навука»,



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На падтрымку сельскай гаспадаркі прадугледжаны амаль трыльён рублёў. Але структура расходаў не дазваляе спадзявацца на тое, што грошы ня трапяць куды звычайна.**

# малараэльны

«Міжнародная дзейнасьць» і г.д. Па гэтых і іншых артыкулах фінансавыя органы дазволілі сабе недафінансаваньне нават намінальных лічбаў. І наадварот, зь перавышэньнем пляну ў ліку іншых былі прафінансаваныя артыкулы «Нацыянальная абарона» і загадкавыя «Іншыя выдаткі» (гл. слупкі 2 і 3 табліцы).

Больш дэталёва дзяржаўныя прыярытэты на 2004 г. можна ўбачыць у табліцы, дзе адлюстраваныя артыкулы расходаў, па якіх плянуецца найбольшы зрух у параўнаньні з 2003 г. Пры ўсёй закансэрвавансасьці структуры расходаў бюджэту гэты зрух даволі значны — ад адных бюджэтных галінаў другім перададзена 10% сродкаў (848 млрд руб., ці 372 млн дал. па прагнозным курсе). Як можна бачыць, у 2004 г. найбольшае грашовае ўзмацненьне ў параўнаньні з 2003 г. атрымалі органы дзяржкіраваньня і сілавыя структуры, сацыяльная палітыка і сельская гаспадарка. Цікава, што каля 80% сродкаў на ўтрыманьне праваахоўных органаў і органаў дзяржкіраваньня прызначаныя на заробкі і кампэнсацыю камунальных паслугаў. Невядома, як гэта паўплывае на ахвоту чыноўнікаў браць хабар, але больш ляяльнымі іх зробіць напэўна.

Як можна бачыць з табліцы, менш прыярытэтнымі ў 2004 г. будуць прамысловасьць, ахова здароўя, капітальныя ўкладаньні і іншыя выдаткі. Расходы на дзяржрэзэрвы паніжаюцца нават у абсалютных лічбах. У той час як у бюджэце Расеі на 2004 г. заплянавалі стабілізацыйны фонд (адной з прычынаў чаго можа быць магчымае адпусканьне ў «вольнае плаваньне» курсу рубля), у Беларусі страхавацца ад крызысаў лічаць залішнім. Увогуле зрухі ў структуры бюджэту, акрамя хіба зьмяншэньня артыкулу «Іншыя выдаткі» за кошт абразаньня дапамогі мясцовым бюджэтам, ня маюць сэнсоўнага эканамічнага абгрунтаваньня. Нахай думаюць палітолягі.

> Непрыярытэтнымі застаюцца падтрымка прадпрымальніцтва й навука. А зь перавышэньнем фінансуюцца абарона і загадкавыя «Іншыя выдаткі».

Згодна з плянамі заробкі да 2006 г. павінны дасягнуць 250 даляраў. Аднак з гэтай прывабнай для насельніцтва лічбай ня ўсё так проста. У пачатку 2001 г. кошт базавых тавараў, якія ўваходзяць у мінімальны спажывецкі бюджэт, складаў 58 дал. (72,9 тыс. руб. пры курсе 1250 BYR/USD). На палове шляху «да высокага заробку» (канец чэрвеня 2003 г.) кошт МСБ складаў ужо 82 USD (169,2 тыс. руб. пры курсе 2065 BYR/USD). Такім чынам, за 2,5 году пакупніцкая здольнасьць даляра ў Беларусі панізілася амаль на 42%. Паніжэньне вартасьці даляра сталася адным з фактараў росту кошту нерухомасьці апошнім часам.

Дзяржбюджэт нездарма называюць адным з асноўных законаў. Прымацца ён павінен як мага больш празрыста. Толькі так можна будзе дабіцца эфэктыўнасьці бюджэтных расходаў. Цяпер жа бюджэты і краіны, і гарадоў маўкліва прымаюцца рэспубліканскай і мясцовымі «палаткамі». Даходзіць і да таго, што аблвыканкам даводзіць памер даходаў гарадзкога бюджэту ад штрафаў і санкцыяў. І прыходзяць чыноўнікі на прадпрыемства пад канец году, калі «гарыць плян», разводзяць вінавата рукамі і кажуць: «Ня мы вас, дык яны нас...»

**Уладзімер Валетка**

### Структура выдаткаў бюджэту, %

| Артыкул расходаў | 2002 (плян) | 2002 (факт) | 2003 (плян) | 2004 (плян) | Зьмяненьне 2004—2003 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. Дзяржаўнае кіраваньне і мясцовае самакіраваньне | 2,8 | 2,8 | 2,4 | 3,1 | 0,7 |
| 3. Нацыянальная абарона | 5,5 | 5,8 | 4,5 | 4,7 | 0,2 |
| 4. Праваахоўная дзейнасьць і бясьпека | 8,7 | 8,7 | 7,7 | 8,2 | 0,5 |
| 7. Прамысловасьць, энэргетыка і будаўнічы комплекс | 0,6 | 0,6 | 0,5 | 0,3 | -0,2 |
| 13. Папярэджаньне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сытуацыяў і стыхійных бедстваў | 6,3 | 3,3 | 4,4 | 5,2 | 0,8 |
| 17. Ахова здароўя | 7,8 | 6,5 | 5,7 | 5,3 | -0,4 |
| 18. Сацыяльная палітыка | 7,6 | 8,1 | 8,2 | 10,9 | 2,7 |
| 20. Папаўненьне дзяржаўных запасаў і рэзэрваў | 1,3 | 1,2 | 1,0 | 0,7 | -0,3 |
| 22. Іншыя выдаткі | 14,1 | 22,1 | 24,3 | 19,0 | -5,3 |
| 23. Капітальныя ўкладаньні | 5,2 | 3,1 | 6,0 | 2,2 | -3,8 |
| 24. Выдаткі дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў | 18,4 | 15,9 | 15,1 | 20,3 | 5,2 |
| у т.л. Рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі, харчаваньня і аграрнай навукі | 7,1 | 7,1 | 6,8 | 11,7 | 4,9 |
| Удзельная вага па дадзеных артыкулаў | 78,3 | 78,0 | 80,0 | 80,0 | - |
| усяго выдаткаў, % | 100 | 100 | 100 | 100 | - |
| млрд руб. | 4238,4 | 4465,3 | 6 598,6 | 8 476,6 | - |

# Больш дзіцячых садкоў і цукровых буракоў

Праграма сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця і адраджэньня вёскі на 2004—2008 г. выконвае найперш прапагандысцкую функцыю. Паўсюль адныя «падвышэньні» ды «росты». Напрыклад, прапануецца павялічыць колькасьць амбуляторыяў у сельскай мясцовасьці ў тры разы! І гэта пры тым, што сельскае насельніцтва зьмяншаецца. Мо варта было б, наадварот, узбуйняць лекарскія ўстановы, забясьпечваючы іх машынамі? Тая ж тэндэнцыя і зь дзіцячымі садкамі. Невядома толькі, скуль дзеці возьмуцца. Таксама плянуецца інтэнсыфікаваць жыльлёвае будаўніцтва ў вёсках, хоць у краіне пустуюць 120 тыс. прыватных дамоў. Але ж хто адмовіцца ад падарунку коштам у 15 тыс. даляраў?

Палажэньні ж вытворча-эканамічнага блёку праграмы знаходзяцца на мяжы фантастыкі. За наступныя чатыры гады плянуецца падвысіць надоі ад адной каровы амаль у два разы — да 4,5 тоны ў год! Такое было б магчыма, калі б усе калгасы аддалі немцам. Але такія крокі ў Праграме не прадугледжваюцца. Цукровых буракоў, што цяпер прыносяць адныя страты аграпрадпрыемствам, заплянавана вырасьціць у 2008 г. у чатыры разы болей, чым летась.

Станоўчым фактам ёсьць тое, што ўлады краіны пачынаюць клапаціцца менавіта пра вёску, а не аграрны сэктар агулам. Вострым пытаньнем зьяўляецца разьвіцьцё вясковай інфраструктуры — дарог, тэлефонная сеткі. Узровень тэлефанізацыі вёсак не дасягае і 50%, тады як у гарадох — 90—95%. Зьвярнуць увагу трэба і на паляпшэньне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх школак. Але пакуль чыноўнікі забаўляюцца папулісцкімі дэклярацыямі, людзі пачынаюць самі вырашаць свае праблемы. Аўтакрамы, шмат у якіх раёнах занядбаныя дзяржавай, сталі прыватнымі і без усялякіх праграмаў якасна абслугоўваюць вяскоўцаў.

**Дамінік Міхайловіч**

СТАТЫСТЫКА

**Паводле справаздачы Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця «Інтэграцыя і рэгіянальная каапэрацыя»:**

| Паказьнік | Беларусь | Расея | Украіна | Казахстан |
|---|---|---|---|---|
| Тэмп росту ВУП, % | 4 | 6,2 | 5,5 | 9 |
| ВУП на душу насельніцтва, $ | 1.437 | 2.400 | 851 | 1.688 |
| Доля прамысловасьці ў ВУП, % | 30,1 | 26,5 | 30,5 | 25,2 |
| Доля сельскай гаспадаркі ў ВУП, % | 10,9 | 6,1 | 13,4 | 10,1 |
| Замежная пазыка/ВУП, % | 5,7 | 44 | 24,6 | 73,9 |
| Простыя замежныя інвэстыцыі (нэта), $ млн. | 250 | 2.500 | 850 | 2.500 |
| Выдаткі на ахову здароўя і адукацыю, % | 11,7 | 6,6 | 8 | 5,3 |
| Шчыльнасьць сотавай сувязі (на 100 чалавек) | 4,7 | 12,1 | 4,4 | 3,6 |
| Тарыф на электраэнэргію, цэнтаў ЗША за кВт/гадз. | 3,2 | 2,4 | 2,6 | 2,7 |

# Найтаньнейшая падпіска на «НН»

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1500 рублёў (2150 рублёў — калі падпісвацца праз «Белпошту»). Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для Вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:** вул.Валадарскага, 16, пак.302 — 227-88-41
**Пункты прыёму падпіскі:** вул.Жукоўскага, 5, корп.1 — 224-32-03
пр.Скарыны, 113 — 264-22-91
вул.Раманаўская Слабада, 9 — 220-83-04
вул.Кашавога, 8 — 230-29-20

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82, корп.2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 223-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | мэтро «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 51, корп.1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | мэтро «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 245-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |

**Шапікі**

| | |
|---|---|
| №2 | Лінгвістычны ўнівэрсытэт, вул.Захарава, 21 |
| №18 | Тэхналягічны ўнівэрсытэт, вул.Сьвярдлова, 13/4 |
| №18 | Пэдагагічны ўнівэрсытэт, вул.Савецкая, 18 |
| №78 | Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19 |
| №95 | Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39 |
| №136 | ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня |
| №187 | Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15 |
| №18 | Аўтавакзал «Маскоўскі» |
| №198 | Эканамічны ўнівэрсытэт, пр.Партызанскі, 26 |
| №209 | Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2 |
| №228 | Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17 |
| №232 | Менскі завод халадзільнікаў, пр.Машэрава |
| №245 | Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56 |
| №259 | Менскі дзяржаўны гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183 |
| №260 | пр.Скарыны, 169 |
| №262 | Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31 |
| №298 | пр.Машэрава, 75/1 |
| №302 | 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8 |
| №313 | Слабадзкі праезд, 24 |

ПАЗЫТЫВЫ

# Запахла грашыма

За першае паўгодзьдзе 2003 г. простых замежных інвэстыцыяў у Беларусь трапіла болей, чым за апошнія пяць гадоў разам. У параўнаньні з 2002 г. рост — 310%. 19% гэтага капіталу паходзяць з Швайцарыі, 13,5% — з Аўстрыі. Фактычна, інвэстыцыйны «голад» пасьпяхова спаталяецца без дапамогі Расеі.

Што здарылася? Дзе падзелася асьцярожнасьць заходніх бізнэсоўцаў? Чаму яны не зважаюць на высновы рэйтынгавых агенцтваў і папярэджаньні сваіх урадаў? Адказ атрымаў днямі, на сустрэчы прадстаўнікоў італьянскіх дзелавых колаў зь мясцовым прадпрымальнікам, які шукае грошай пад свой праект.

Уявіце сабе «шараговага» эўрапейскага мільянэра. Не ўладальніка банкаў, заводаў і параходаў, а звычайнага мільянэра, якога ў некаторых клясыфікацыях вызначаюць як вяршыню сярэдняе клясы. Справа яго жыве, пакуль пашыраецца; як не пашыраецца — хірэе і зьнікае. Такія законы рынку: альбо расьці, альбо дай расьці іншым. Вольных грошай у яго — ад некалькіх сот тысяч да мільёнаў пяці эўра. Варыянты ўкладаньня:

— Дэпазыт. Пасьля выплаты падаткаў і камісійных разьлічваць на плюс не даводзіцца.

— Каштоўныя паперы. Самому лезьці на фондавы рынак не выпадае. Зьвярнуцца ў траставую кантору? Шукайце дурных! Лепш застацца пры сваім, чым падараваць усё спадарыні Біржавой Каньюнктуры.

— Новыя бізнэсы. Самы прыбытковы ў Эўропе бізнэс у 2002 г. — гандаль хатнімі расьлінамі праз Інтэрнэт. Ня кожны ў гэта верыць.

Эканомікі разьвітых краінаў перанасычаныя. Вось і езьдзяць такія італьянцы то па Ўсходняй Эўропе, дзе яны ўжо спазьніліся, то па Расеі, дзе на другі дзень іх ужо «крышуюць». Папыкаліся, памыкаліся — завіталі ў Беларусь. І што бачаць? Нішаў — сотні, канкурэнцыя — першабытная, улада — пажыцьцёвая, мафія й карупцыя — каля нуля. Гэта ж курорт! Бяры й багацей! Прастора ня толькі для доўгатэрміновых дарагіх праектаў, але й для каротказтэрміновых — самых выгадных і надзейных.



> Нішаў — сотні, канкурэнцыя — першабытная, улада — пажыцьцёвая, мафія й карупцыя— каля нуля. Гэта ж курорт!

Буйныя карпарацыі прывыклі прыходзіць з сваімі законамі і навязваць сваю ўладу. Яны гадамі таргуюцца з урадамі. Бізнэсу драбнейшаму ня церпіцца: ён ідзе хутчэй.

Варта было сьцішыць рыторыку пра «вашывых блохаў», як грошы адчулі, дзе пахне грашыма. Дык такі патрэбныя мы Эўропе ці не?

**Вацлаў Заякоць**

# Вінцук Вячорка: Якія расколы?..

**20 сьнежня адбудзецца зьезд Партыі БНФ. Старшыню Вінцуку Вячорку давядзецца трымаць справаздачу. Тым часам, паводле вынікаў апытаньня сацыялягічнай службы «Люстэрка», у Менску па папулярнасьці Вячорка выйшаў у лідэры сярод апазыцыйных палітыкаў. Аднак гутарка з В.Вячоркам пачалася зь іншага пытаньня.**

**«НН»: Спадару Вінцук, а чаму ў БНФ такі катастрафічна нізкі рэйтынг?**

Вінцук Вячорка: Які?

**«НН»: Катастрафічна нізкі, пра які сьведчаць сацыялягічныя апытаньні.**

**В.В.:** І які?

**«НН»: Некалькі адсоткаў...**

**В.В.:** Карыстаючыся зьвесткамі, якія нам дае Міжнародны рэспубліканскі інстытут (а ён замаўляе апытаньні літоўскай сацыялягічнай службе «Балтыйскія дасьледзіны»), мы адсочваем дынаміку рэйтынгаў. І калі задаецца пытаньне пра сымпатыі да той ці іншай партыі з прапанаванага сьпісу, БНФ знаходзіцца ў межах 20%. Што да адкрытага выбарчага рэйтынгу, дык мы без падрыхтоўкі маем каля 7%, нароўні з камуністамі. Так што я абсалютна ніякае катастрофы тут ня бачу.

**«НН»: Набліжаецца зьезд БНФ, зноў пачаліся гаворкі пра чарговы раскол.**

**В.В.:** Я такіх гаворак ня чуў.

**«НН»: А група Фёдарава, якая паспрабуе высунуць Вам на зьезьдзе альтэрнатыву, а ў выпадку паразы — сысьці?**

**В.В.:** Мы ствараем сучасную, дынамічную, арганізаваную партыю. Калі на ўзроўні абмеркаваньня павінна панаваць свабода думак, дык пасьля прыняцьця рашэньня наступае пэрыяд дысцыплінаванага выкананьня. На жаль, некаторыя гэтага не разумеюць. У Азэрбайджане сёньня пяць Народных Франтоў. Спэцслужбы Аліевых выкарыстоўвалі амбіцыі людзей і калолі, калолі Народны Фронт — калісьці самую магутную апазыцыйную арганізацыю. Цяпер пра яго, што называецца, і куры ня шэпчуць. Мы падобнага не дапусьцім.

**«НН»: Вы лічыце, што асноўная прычына расколаў у БНФ — дзейнасьць спэцслужбаў?**

**В.В.:** Асноўная прычына — у амбіцыях. Расколаў ніякіх пакуль не праглядаецца. А чуткі-плёткі запускаюцца перад любым фронтаўскім зьездам. Гэта натуральна, як прагноз надвор'я, які ўсё роўна ня спраўджваецца.

**«НН»: «Пяцёрка+» плянавала ў рамках сваёй першай акцыі 10 сьнежня арганізаваць выхад актывістаў да прахадных прадпрыемстваў. Але чаму ў Менску гэтага не было?**

**В.В.:** 10 сьнежня цэнтральнай акцыяй у Менску быў «ланцуг памяці», а што да выхадаў на прахадныя з улёткамі на сацыяльныя тэмы, дык яны былі — і ў Менску, і ў абласных гарадах (Гомель, Магілёў).

**«НН»: А чаму за тры месяцы існаваньня «Пяцёркі+» не правяла ніводнай заўважнай акцыі?**

**В.В.:** Прэзэнтацыя «Пяцёркі+» адбудзецца 15 студзеня. Пасьля пачнецца ўсё тое, пра што вы пытаецеся.

**«НН»: Што робіць БНФ для яднаньня нацыянальна-дэмакратычных сілаў Беларусі?**

**В.В.:** Я цешуся, што «пасеянае» Фронтам у пачатку 90-х — сьцьверджаньне незалежнасьці Беларусі як абсалютнай каштоўнасьці, павага да мовы, сымболікі і гістарычнай памяці — становяцца абавязковымі ўмовамі любога сур'ёзнага палітыка. Дзякуючы падмурку, закладзенаму БНФ, незалежнасьць як conditio sine qua non (абавязковы варунак) ёсьць у плятформе «Пяцёркі+».

**«НН»: На нядаўнім зьезьдзе КХП-БНФ у дакладзе старшыні партыі было заяўлена, што ўсе дзеячы, якія пойдуць на выбары ў палату прадстаўнікоў, будуць залічаныя да здраднікаў і калябарантаў.**

**В.В.:** У 1989 г. БНФ удзельнічаў у выбарах у Вярхоўны Савет СССР, удзельнічаў і ў 1990 г. у выбарах у Вярхоўны Савет БССР — паводле савецкага заканадаўства, маючы савецкія камісіі і савецкія рэаліі вакол. Але, прарваўшыся ў Вярхоўны Савет, фронтаўцы зрабілі яго сапраўдным парлямэнтам незалежнай Беларусі. Быў час, калі неабходна было байкатаваць выбары, цяпер сытуацыя іншая. Ад нашага ўдзелу ці няўдзелу абсалютна не залежыць міжнародны статус створаных Лукашэнкам структураў. Сёньня мы выбіраем: ісьці ці не ісьці да людзей. Нам трэба натхніць іх на перамогу, паказаць, што мы жывыя і дзеяздольныя, што бачым людзкія праблемы й ведаем, як іх вырашаць.

**«НН»: У чым прычына паразаў расейскіх СПС і «Яблыка»?**

**В.В.:** Каля 18% расейцаў бачаць адносіны зь Беларусяй як адносіны дзьвюх незалежных дзяржаваў. Здаровыя настроі ў невялікай часткі расейцаў ёсьць, але ніводная палітычная сіла не захацела іх узяць на ўзбраеньне. СПС зрабіў найгрубейшую памылку, заявіўшы вуснамі Чубайса пра лібэральную імпэрыю. Гэта іх і пахавала, бо ўсё адно найлепшым носьбітам імпэрыялізму будзе Пуцін.

**«НН»: І тым ня менш некаторыя апазыцыянэры кантактавалі з СПС...**

**В.В.:** «Пяцёрка+» як міжпартыйнае паразуменьне ніколі не кантактавала з СПС. Кантактавалі з СПС асобныя партыі, за дзеяньні якіх мы не адказваем.

**«НН»: А ці былі Вы запрошаныя на сустрэчу зь Нямцовым?**

**В.В.:** Не. І цалкам камфортна пачуваюся. БНФ не пасылаў нікога дапамагаць СПС на выбарах.

**«НН»: Калі Беларусь увойдзе ў Эўразьвяз?**

**В.В.:** Я адлічваў бы гэты момант ад сыходу Лукашэнкі. Ведаю, што людзі зь яго адміністрацыі нефармальна сустракаліся з апазыцыянэрамі ды прапанаваліся ім тэзу «ў Эўропу з прэзыдэнтам». У сэнсе, з Лукашэнкам. На гэтыя ілюзіі купіліся і некаторыя публіцысты, у тым ліку нашаніўскія. Нам трэба даць рады Лукашэнку, і тады застанецца пачакаць 7—9 гадоў для поўнага сяброўства ў ЭЗ.

**«НН»: Зянон Пазьняк кажа, што Беларусі аднолькава непатрэбныя ні расейская імпэрыя, ні Эўразьвяз, а выхад мог бы быць у Балтыйска-Чарнаморскім саюзе.**

**В.В.:** Адразаць эўрапейскую пэрспэктыву — сваімі рукамі здаваць сябе ўсходняму суседу. І літоўцы з украінцамі гэта выдатна разумеюць. Балтыйска-чарнаморскі хаўрус быў прыгожай канцэпцыяй, якая магла б рэалізавацца ў пачатку 90-х. Але ўваход балтыйскіх краінаў у ЭЗ і NATO сытуацыю спрашчае.

**«НН»: Што б Вы лічылі посьпехам на выбарах у палату прадстаўнікоў?**

**В.В.:** Выбарамі гэта назваць нельга. Зьместам кампаніі для нас ёсьць праца зь людзьмі. Калі б у палаце прадстаўнікоў бальшыня крэслаў запоўнілася нелукашэнкавымі людзьмі, гэта азначала б яго палітычны канец. Таму можна сказаць, што ў 2004-м адбудуцца прэзыдэнцкія выбары — задоўга да прэзыдэнцкіх выбараў.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Азэрбайджане сёньня пяць Народных Франтоў. Мы падобнага не дапусьцім.

# Ліцэйская фізкультура

**Ліцэй сустракае Каляды ў турботах і трывогах. Выкладчыкі шукаюць памяшканьні, бацькі — грошы на арэнду спартзалі й камп'ютарнай клясы. Нэрвуюць чыноўнікі аддзелаў адукацыі: чаму дзеці ня вучацца «як усе»? А часам зьяўляюцца і зусім трывожныя чуткі.**

Вось і на гэтым тыдні ў рэдакцыю «НН» зьвярнуліся вучні Беларускага ліцэю: паводле іхнай інфармацыі, Мінадукацыі рыхтуецца адмяніць форму экстэрнату. Нібы магчымасьць здаваць іспыты экстэрнам пакінуць толькі для тых, хто ня можа наведваць школу па стане здароўя.

Супрацоўнік галоўнага ўпраўленьня агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства Вячаслаў Мацюшэнка зазначыў, што ніякіх зьменаў ані ў Законе аб адукацыі, ані ў Палажэньне аб экстэрнаце не рыхтуецца: «Толькі ўлетку было прынята Палажэньне, навошта яго так хутка зьмяняць?»

І ўсё ж на выпадак, вядомы з часоў грашовае рэформы савецкага міністра Паўлава, ліцэй мае запасны варыянт. «Ёсьць краіны, гатовыя прызнаць дыплёмы, якія мы дамо выпускнікам, і даць ім магчымасьць здаваць выпускныя іспыты ў іх», — зазначыў Лявон Баршчэўскі.

Турбот і трывогаў перад Калядамі не паменела. Ліцэісты па-ранейшаму займаюцца на прыватных кватэрах. 25 лістапада Бацькоўская рада накіравала міністру Аляксандру Радзькову ліст з прапановай у сямідзённы тэрмін сустрэцца для пошуку «шляхоў выхаду зь недарэчнага становішча». Адказу не было. У сем'і ліцэістаў па-ранейшаму зьвяртаюцца настаўнікі й дырэктары мясцовых школаў, да некаторых завітвалі ўчастковыя — цікавіліся, чаму дзеці «ня ходзяць у школу».

З 123 ліцэістаў, якія пачыналі навучальны год у сквэрыку каля «Дынама», засталіся вучыцца 115. Адзін сышоў, бо сям'я пераехала ў іншы горад. Некаторых адлічылі зь ліцэю за банальную непасьпяховасьць. Адкалоліся многія навучэнцы зь Менскага раёну — на іх ціснулі мацней, чым на менскіх. «Калі ў пасёлку ўсяго адна школа, дзіця будзе здаваць іспыт экстэрнам толькі там. І вельмі вялікая імавернасьць, што яму не дазволяць здаць нармальна», — кажа Л.Баршчэўскі.

Каляды ліцэісты зьбіраюцца сустракаць конкурсам на найлепшую страву ды новымі пастаноўкамі тэатру — п'есамі «Рамэа і Джульета» паводле Шэкспіра ды «Ліліт», напісанай кіраўніком тэатру Сяргеем Патаранскім.

У Бацькоўскай рады клопаты не такія прыемныя: бракуе грошай. У найбольш бядотным стане апынуліся настаўнікі. Цягам трох месяцаў яны жылі на грошы, атрыманыя ў якасьці выходнай дапамогі падчас звальненьня. Гэтыя сродкі скончыліся, а дапамогі з боку бацькоў і ахвярадаўцаў не хапае. Па-ранейшаму няма грошай на арэнду спартовай залі, кабінэтаў інфарматыкі, рэпэтыцыяў тэатру. Каб дзеці хоць неяк займаліся фізкультурай, многія пазапісвалі ў спартовыя сэкцыі. Але ня ўсе сем'і маюць на гэта грошы, і некаторыя ліцэісты абмяжоўваюцца шпацырамі з аднае «яўкі» на іншую. «Таксама гімнастыка», — жартуе Баршчэўскі.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Аркадзь Шанскі**

**Ахвяраваньні на ліцэй можна пералічваць праз НП ТАА «Тэхналёгіка» УНН 190350702 р/р 3012000003937 ф/л №4 ААТ «Белгазпрамбанк», Менск, код 107 ці зьвяртацца на тэл.: 242-85-16 (Сяргей).**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

7 сьнежня на стадыёне «Дынама» ў Менску быў затрыманы прадпрымальнік, сябра Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Прыватная ўласнасьць» **Віктар Новікаў**: ён распаўсюджваў улёткі з запрашэньнем на акцыю 10 сьнежня. Ахова рынку даставіла яго ў гараддзел міліцыі №1, дзе на Новікава склалі пратакол паводле арт.167 АК. Ноч затрыманы правёў у спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку, 8 сьнежня быў аштрафаваны на 20 базавых велічыняў. Падчас акцыі «Мы помнім» 10 сьнежня ў Менску з партрэтамі зьніклых у руках была затрыманая актывістка «Хартыі'97» **Натальля Каляда**. Яе завезьлі ў Цэнтральны РУУС Менску, але праз гадзіну выпусьцілі. У Барысаве 10 сьнежня, падчас аналягічнай акцыі, былі затрыманыя актывісты незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Зубр» **Аляксандар Моніч**, **Яўген Сіліч**, **Аляксандар Казакоў**, **Зьміцер Моніч**, **Яўген Восіпаў**, **Алесь Малчанаў**, **Кацярына Зелянкова**, **Віталь Барысавец**. В.Барысаўца ў аддзеле міліцыі зьбілі, а на А.Моніча склалі пратакол паводле арт.167 АК (парушэньні падчас вулічных мерапрыемстваў).10 сьнежня ў Берасьці была затрыманая **Ніна Давыдоўская**, якая раздавала ўлёткі-віншаваньні, прысьвечаныя Міжнароднаму Дню правоў чалавека. 11 сьнежня каля Менгарсуду затрымалі **Аксану Новікаву** з плякатам «Беларусі патрэбны суд прысяжных». На яе склалі пратакол паводле ўсё таго ж арт.167 АК і папярэдзілі, што пры наступных парушэньнях яна можа на год патрапіць у жаночую калёнію: мае ўмоўны прысуд за «абразу прэзыдэнта». 16 сьнежня актывісты «Зубра» **Любоў Кучынская** і **Сяргей Рыкаў** былі асуджаныя на 10 базавых адзінак кожны (165 тыс. руб.): маладых людзей затрымалі ў Заслаўі пры канцы лістападу за распаўсюд «зуброўскай» газэты «Супраціў».

**АШ**

# Дзень «Пабеды»

У суботу ў Менску адзначылі дзень народзінаў аўтамабіля. «Пабедзе» Якуба Коласа стукнула 50



АЛЕНА АНДРЭЕВА

Нашыя літаратурныя клясыкі не былі людзьмі багатымі. Летуценны Купала так і не пасьпеў разжыцца ўласным аўтамабілем: «эмку» атрымаў ад дзяржавы, «шэўрале» — ад грамадзкасьці Беластоку пасьля «вызвольнага паходу» 1939-га. Гаспадарлівы Колас хоць пад канец жыцьця, а займеў сваю машыну. Яго «Пабеда-М20» каштавала ў 1953-м 16 тыс. «сталінскіх» рублёў. Гэта якраз на ёй Колас у апошні дзень жыцьця наведаўся ў Курапаты.

Пасьля Коласа «Пабедай» езьдзіў яго сын, нявестка, а з 1966-га машына стала на якар. Прычым каля 15 гадоў портам яе прыпіскі была пляцоўка пад адкрытым небам. Мілімэтровае жалеза выпрабаваньне вытрымала. Парогі падгнілі, у крылах дзіркі, але збольшага стан неблагі. Дый прабег — усяго 59302 км.

«Пабеда» належыць Андрэю Міцкевічу — унуку Коласа. Ён і вёў рэй у часе сьвяткаваньня «народзінаў». Сродкаў на рэстаўрацыю машыны ён ня мае — у многім гэта й было прычынай арганізацыі мерапрыемства. З чорнага нетра гаражу Літаратурнага музэю Якуба Коласа «Пабеду» выцягвалі спачатку лябёдкай, а пасьля, плюнуўшы, папросту талакою. Журналісты торгалі трос, коўзаючыся па лёдзе. «Ліцьвін» Уладзімер Бярбераў тым часам граў на жалейцы «Спадчыну». Хоць і Купалаў верш, а глядзелася лягічна. Абтрусіўшы венікам пыл стагодзьдзяў, узяліся спрачацца — якога ж «Пабеда» колеру? Мэталік не мэталік, фіялетавы не фіялетавы. Умоўна можна назваць сьлівовым. Як у той показцы пра вішнёвага ката: «А што — хіба вы ніколі ня бачылі чорных вішняў?»

Хрумстаючы яблыкі, якімі частаваў гаспадар, «Пабеду» аглядалі, абмяралі, фатаграфавалі, напампоўвалі колы. Угледзелі, што левае пярэдняе крыло — замененае. А пасьля зацягнулі зноў у гараж. На пытаньне, чаму менавіта 13 сьнежня адзначаем, Васіль Цярэшка, кіраўнік Таварыства абароны помнікаў тэхнікі і транспарту «Наша перамога», адказаў: «Год сканчаецца, трэба пасьпець адсьвяткаваць». Сам ён прыехаў на «народзіны» «Пабедай» такой самай мадэлі, толькі на пяць гадоў маладзейшай. Чырвоная, бліскучая — як лялечка. Коласаву бярэцца адрэстаўраваць яшчэ лепей.

**АС**

# «Скрыпка дрыгвы» пад сярпом часу

**Роўна два гады таму, на хвалі папулярнасьці альбому «Я нарадзіўся тут», ініцыятар супольных праектаў Алесь Суша прапанаваў зрабіць складанку на вершы Ўладзімера Караткевіча. І, здаецца, пайшла справа: Вольскі, Памідораў, Вайцюшкевіч, Корань зрабілі свае песьні. Алесь Пушкін узяўся аздобіць альбом. Прэса на ўсе застаўкі анансавала выхад «Personal Караткевіч» з працоўнай назвай «Скрыпка дрыгвы». Але альбому дагэтуль няма. Чаму — разьбіраўся карэспандэнт «НН».**

Кожны ўдзельнік праекту называе свае прычыны. Алесь Суша нявыхад «Скрыпкі» патлумачыў так: «Паслухаўшы дэма-варыянты, я зразумеў, што гэта будзе крок назад у параўнаньні зь «Я нарадзіўся тут». Аляксандар Памідораў зважае на псыхалягічную стомленасьць удзельнікаў праекту: «Вар'яцкая сямейка «Народнага альбому» была тры гады разам — сумесныя канцэрты, гастролі, альбомы… Гэта адбілася на псыхалягічным стане музыкаў». Гэтаксама лічыць Лявон Вольскі. Аляксандар Кулінковіч адной з галоўных называе прычыну тэхнічную: «Мы ўсе пісаліся на студыі БТ, дзе трэба граць ужывую. А «Нэйра Дзюбель» прызвычаіўся рабіць запіс на аналягавай студыі, у якой можна было пісацца кавалкамі, нешта мяняць месцамі і г.д.». На тэхнічныя праблемы наракаюць і Памідораў, і гукарэжысэр запісу Сяргей Лабандзіеўскі.

Адразу пасьля запісу «Скрыпкі» Лабандзіеўскі з Вольскім зьехалі ў Польшчу запісваць «Крамбамбулю», іншыя музыкі таксама занялiся сваімі праектамі, і колькі месяцаў да «Скрыпкі» нікому не было справы. БТ ж захоўвае запісаныя бабіны максымум два месяцы, бо яны занадта дарагія: рулён на трыццаць хвілінаў каштуе 120—150 даляраў, а матэрыялу было запісана ажно на тры бабіны.

У лютым 2002 г. усе бабіны з трэкінгам (арыгіналы інструмэнтальных і вакальных партыяў, запісаныя паасобку) былі сьцёртыя. Пра гэта Памідораву паведаміў галоўны гукарэжысэр студыі БТ Валер Грабенка. Музыканты нічога не маглі зрабіць, бо выкупіць запіс самі ня мелі грошай, а Суша на той час цікавасьць да праекту згубіў. «Можа, і добра, што так выйшла, бо гэта нельга было выдаваць», — кажа ён.

Але праект працягваў жыць сваім жыцьцём. Эскізы, зробленыя Алесем Пушкіным да гэтага праекту, можна пабачыць у музэі Караткевіча, што ў Воршы. Зьміцер Вайцюшкевіч з «WZ-orkiestra» зрабіў яшчэ колькі песьняў на вершы Караткевіча ды «абкатаў» іх на сваіх канцэртах — за год такіх песень у Тодара назьбіралася на сольны праект. Корань наноў запісаў свае кампазыцыі на вершы Караткевіча ды ўпрыгожыў імі новы дыск «Улісу» «Люстэрка». Памідораў уключыў твор «Прыганятыя» ў сольнік «Сьвята пакрадзенае» ды напісаў новую песьню паводле Караткевіча — «Данесьлі добрыя людзі». Кулінковіч пасьля «Скрыпкі дрыгвы» вырашыў сьпяваць па-беларуску. За паэзію Караткевіча ўзяліся і маладыя гурты — «Сьцяна» («Паўстанцам 1863 г.»), «Кіці Кэт» («Заяц варыць піва») і г.д. Толькі Вольскі песень са «Скрыпкі» ня грае і перазапісваць ня думае: «Гэта не ўкладаецца ў ніводзін мой праект». Лявон зрабіў для трыб'юту Караткевіча чатыры кампазыцыі («Паўстанцам 1863 г.», «Амаль хрысьціянскі тост за ворагаў», «Стары певень», «Зімовы дуб»).


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Алесь Суша: Беларускія рокеры не каштуюць 450 даляраў

Несупынная цікавасьць музыкаў ды журналістаў заахвоціці ўдзельнікаў да аднаўленьня праекту пад назовам «Павей, вецер». З ініцыятывы Памідорава ды інтэрнэт-дызайнэра, вядомага як Вецер Мэханічны, да Каляд паўстане інтэрнэт-сайт з падрабязнай інфармацыяй, тэкстамі ды трэкамі ў MP3. Праз Інтэрнэт Суша мае абвесьціць пра набор новых удзельнікаў: цяпер ён пляную выдаць падвойны дыск на вершы Караткевіча.

**Сяргей Будкін**

# Тату паводле Караткевіча


Алесь Пушкін

СЯРГЕЙ ГЛОБА

**12 сьнежня ў Аршанскім музэі Ўладзімера Караткевіча ўрачыста адкрылася выстава «А.Пушкін і яго-ная Беларусь».** Адкрыцьцё прайшло з удзелам мастака. Зь вершамі і песьнямі выступілі горача сустрэтыя прысутнымі Андрэй Хадановіч ды Анатоль Івашчанка. Адбылася і прэзэнтацыя літаратурна-мастацкага часопісу «Дзеяслоў». Мастака і аршанцаў вітаў яго галоўны рэдактар Барыс Пятровіч.

На выставе, апроч вядомых ужо твораў, упершыню выстаўленыя 16 узораў для татуіровак, зробленыя мастком паводле матываў творчасьці Ўладзімера Караткевіча.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

# Фінберг: праграма паводле Караткевіча

**Дзяржаўны канцэртны аркестар Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга прэзэнтаваў новую праграму «Ўладзімер Караткевіч. Новыя песьні».** Падзея адбылася 16 сьнежня ў клюбе імя Дзяржынскага.

Гэта ўжо 17-ы канцэрт аркестру з цыклу «Славутыя імёны Беларусі». Перад тым былі створаны праграмы на вершы Міцкевіча, Купалы і Коласа, Барадуліна. «Я прачытаў усю лірыку паэта і зразумеў: гэта сапраўды нацыянальны геній, — прызнаецца Фінберг. — На момант пачатку працы існавала толькі адна песьня на верш творцы. Цяпер толькі ў нашым рэпэртуары іх блізу трыццаці. Нялёгка працавалася з тэкстамі паэта, арыгінальнымі паводле самой будовы».

Паводле словаў Фінберга, часьцяком у аркестру ўзьнікаюць праблемы з напаўненьнем заляў, асабліва ў Менску: «Тыя арганізацыі, што мусяць гэтым займацца, не заўжды выконваюць свае абавязкі». Ці стануць «новыя песьні» Караткевіча гітамі? «Гіты робяць на ТБ і радыё. Калі яны вырашаць зрабіць крок насустрач беларускаму слову, будуць гіты», — кажа Фінберг.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Сяргей Трафілаў**

## 19 сьнежня пятніца

### ● БТ
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 23.40 «Мая краіна».
9.05 Сэрыял «Справа Дрэйфуса».
10.05, 17.05 Сэрыял «Уваскрашаючы мёртвых». Фільм 5-ы «Сьляпы жабрак».
11.10 Сэрыял «Цыган». Заключная сэрыя.
12.10 Маст. фільм «Зачараванае каханьне».
14.05 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстваль песьні.
15.15 Маст. фільм «Успомніць усё». 1-я сэрыя.
16.05 «5х5».
18.05 «Славянскі базар у Віцебску-2003. Выбранае».
19.05 Маст. фільм «Меркаваньні бакоў».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.45 Спэцыяльны рэпартаж. «Код краіны. 475».
22.00 Конкурс прыгажосьці «Міс Сьвету-2003».
23.50 Маст. фільм «Экзыстэнцыя».

### ● ЛАД
7.00, 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 Дак. сэрыял «Клешч і птушка».
8.05, 22.05 Сэрыял «Пецярбурскія таймы».
9.00 «Сьвятло далёкай зоркі. Эдуард Міцуль».
9.30 «Сьпявай, душа!». «Слуцкі край».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.05 «Урокі цётухны Савы. Арытмэтыка-малышка». Мультфільм.
11.15 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Драма «Хам». 3-я сэрыя.
13.05 «Час кіно».
13.35 Дак. фільм «Усе мы Суворава дзеці».
14.10 «Масква—Менск».
14.25 Любімыя казкі. «Рыжы, сумленны, закаханы».
16.50 «Час кіно».
17.20 «Крыж на зямлі і поўня ў небе». Маст. фільм.
18.50 Драма «Хам». 4-я сэрыя, заключная.
20.15 «Калыханка».
20.30 «Справы сямейныя».

### ● СТВ
6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 20.15 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Мазгавая атака».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Тэатральныя гісторыі».
10.55 Дак. фільм «Твар бяз грыму».
11.30 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 Фэстываль газэты «Минский курьер».
13.50, 18.30 «Інструктар». Сэрыял.
14.45 «Антрапаграфія, альбо Славянскі вобраз Дар'і Чарняўскай». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
15.00 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.15 «Тэма дня».
16.50 Кіно: маст. фільм «Пакаяньне», 2-я сэрыя.
18.20 «Сьвецкая хроніка».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Остын Паўэрз, супэршпіён».
23.15 «Рэактыўны бокс».
23.35 «Навіны СНД».
23.50 Кіно: драма «Нашы Каляды».

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.45 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.55 Сэрыял «Участак».
10.50 «Невядомая плянэта». «Містыка Каталёніі».
11.15 Сэрыял «Твінісы».
14.35 «Горад жанчын».
15.35 «Угадай мэлёдыю».
16.05 Сэрыял «Бераг мары».
16.55 «Апошні герой».
18.15 «Чалавек і закон».
18.50 «Поле цудаў».
20.00 Час.
21.05 Валерыя. «Краіна каханьня».
22.15 Што? Дзе? Калі? Фінал зімовых гульняў.
0.00 Маст. фільм «Жаночыя таямніцы».

### ● РТР
7.45 Сэрыял «Лініі лёсу».
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Пакой сьмеху.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Камэдыя «Іронія лёсу, ці Лёгкі дух!».

### ● НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Маст. фільм «Сучасная жанчына».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.25 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 «Нацыянальная бясьпека: пояс шахіда».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Выхад дракона».
22.15 Супэрбокс: Майкл Грант супраць Дамініка Гуіна.
23.05 Начныя музы.
23.20 «Стыль ад...».

### ● Эўраспорт
9.30 Конны спорт. 10 найлепшых. Жэнэва. Паўтор.
10.30 Фэхтаваньне. Левалойс.
11.00 Біятлён. Кубак сьвету. Жанчыны. Паўтор.
12.00, 19.00 Біятлён. Кубак сьвету. Мужчыны. Паўтор.
13.15 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Гіганцкі слалам. Мужчыны. Гродэн. Жывая трансьляцыя.
15.15 Біятлён. Кубак сьвету. Спрынт. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
17.00 Футбол. УЭФА. Ліга чэмпіёнаў. Клясыка. Часопіс.
20.45 Ралі. Часопіс.
21.30 Ралі рэйд. Паўтор.
22.00 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс. Паўтор.
23.00 Конны спорт. Спаборніцтвы ў канкуры. Лёндан. Жывая трансьляцыя.
0.15 К-1. Гран-пры. Лас-Вэгас. Паўтор.

## 20 сьнежня субота

### ● БТ
7.35 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.00 «Новая калекцыя».
8.25 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «ТАСС упаўнаважаны заявіць...».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.50 «Шпілька».
11.20 «Адкрыты архіў».
11.45 Маст. фільм «Вецер «Надзеі».
13.05 «Кропка».
13.50 «Маскі-шоў».
14.10 Сэрыял «Адрэналінавы выбух».
15.05 Маст. фільм «Сьцяпан Сяргеевіч». 1-я і 2-я сэрыі.
17.25 Мэлядрама «Зрабі мне балюча».
18.40 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.20 Маст. фільм «Жыць як каралі».
21.20 «Вакол плянэты».
21.50 Драма «Нязначны чалавек».
23.30 Трылер «Асноўны інстынкт».

### ● ЛАД
8.05 Мультыклюб.
9.00 «Правінцыйныя гісторыі».
9.25 Наша спадчына. «Белавеская пушча. Уладаньне Вялікіх князёў Літоўскіх».
9.40 Дак. сэрыял «Ахоўнікі прыроды».
10.05 Маст. фільм «Грэшніца». 1-я сэрыя.
11.30 «Здароўе».
12.00 «Ляўша». Мультфільм.
12.45 Мультсэрыял «Трышчан ды Іжота — забытая легенда».
13.10 Любімыя казкі. «На шчупаковы загад».
14.05 «Ёсьць толькі міг...».
14.35 «Настаўніцкая».
14.50 «Эх, паказка, паказка».
15.00 «Сьпявай, душа!».
15.30 Дак. сэрыял «Мастакі».
15.55 Сэрыял «Адвакацкая кантора».
16.50 «Росчырк часу».
17.00 Плошча мастацтваў.
17.25 «Іншыя танцы».
17.35 Дэтэктыў «Мёртвы сэзон». 1-я сэрыя.
18.40 Сэрыял «Бацькі й дзеці».
20.00 «Рэгіён».
20.30 Камэдыя «Падкідыш».
21.45 Маст. фільм «Гаспадар гатовых строяў».

### ● СТВ
6.30 «Дзікая плянэта»: «Сафары на паветраным шары». Дак. фільм.
7.30 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Сэрыял.
8.40 Дак. фільм «Дыярыюш Наваградзкі».
9.05 «Вялікае сьнеданьне».
9.35 «Анфас».
9.50, 20.00 «СТВ-спорт».
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.25 «Партрэт у інтэр'еры».
10.40 «Запрашаем паскардзіцца...».
10.50 «Разам».
11.20 «Тэлеафіша».
11.30, 0.15 «Бафі». Сэрыял.
12.20 «Дзікая плянэта»: «Усё пра сабак». Дак. фільм.
12.50 Кіно: камэдыя «Каханьне злое».
14.55 «Усё для цябе».
15.30 «Клясыка гумару».
16.05 «Тэатар на СТВ»: «Князь Вітаўт».
17.40 Кіно: камэдыя «Іншае жыцьцё».
19.30 «24 гадзіны».
20.15 Кіно: маст. фільм «Таксі».
22.00 «Вялікая музыка».
22.35 «Навіны СНД».
22.50 «Арт-хаўз»: драма «Агент «Страказа».

### ● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому. Сяргей Бязрукаў. Масква».
11.15 Дог-шоў.
12.00 Навіны (з субтытрамі).
12.10 «Зьвяры: унутраны сьвет».
13.00 Хакей. Міжнародны турнір «Кубак «Балтыкі». Зборная Швэцыі — зборная Расеі.
15.10 Дыснэй-клюб. «Мышыны дом».
15.35 Разумніцы й разумнікі.
16.15 Канцэрт Ільлі Рэзьніка «Маленькая краіна».
16.55 Маст. фільм «Фрэнкі і Джоні».
19.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 Апошні герой.
22.05 «Залаты грамафон».
23.10 Баявік «Тонкая чырвоная лінія».

### ● РТР
9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 Круты маршрут — Поўдзень.
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Кар'ера Дзімы Горына».
15.00 Маст. фільм «Сакольнік Тамаш».
17.00 «Жарты гумару». Канцэрт.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Баявік «Герой-адзінец».

### ● НТВ
9.00 Кулінарны паядынак.
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.55 Спорт «Лято 6 з 49».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 «Дзікі сьвет: танцы са сьпевамі».
12.05 Дэтэктыў «Дыямантавая пастка».
14.05 Свая гульня.
15.15 «Жаночы погляд».
15.55 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: шчасьце».
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Маст. фільм «Залаты век».
21.15 Маст. фільм «Прысяжная».

### ● Эўраспорт
9.30 Біятлён. Кубак сьвету. Спрынт. Мужчыны. Паўтор.
10.30 Футбол. УЭФА. Ліга чэмпіёнаў. «Шчасьлівая гадзіна». Паўтор.
11.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Жанчыны. Лаакс. Жывая трансьляцыя.
13.00 Біятлён. Кубак сьвету. Спрынт. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
14.30 Горныя лыжы. Гродэн. Жывая трансьляцыя.
15.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Энгельбэрг. К-120. Жывая трансьляцыя.
16.45 Бабсьлей. Кубак сьвету. Альтэнбэрг. Двойкі. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
18.00 Біятлён. Кубак сьвету. Спрынт. Жанчыны. Паўтор.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Энгельбэрг. К-120. Паўтор.
20.30 «Алімпійскія гульні». Часопіс.
21.00 Бокс. ТВА. Жывая трансьляцыя.
23.00 Конны спорт. Спаборніцтвы ў канкуры. Лёндан. Жывая трансьляцыя.
0.15 Экстрэмальныя віды спорту.
1.00 К-1. Гран-пры. Токіё. Паўтор.

## 21 сьнежня нядзеля

### ● БТ
7.35 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.00 «Любы капрыз».
8.30 «Арсэнал».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «ТАСС упаўнаважаны заявіць...».
10.00 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Узда. Мястэчка першадрукаваньня».
11.20 Маст. фільм «Да мяне, Мухтар!».
12.50 «Чэмпіёны. Алена Попчанка».
13.05 Тэлеклуб «Ваша лято».
13.50 «Маскі-шоў».
14.10 Сэрыял «Адрэналінавы выбух».
15.05 КВК. Фінал Эўралігі.
16.45 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
17.25 Дэтэктыў «Забойства ў Саншайн Мэнар».
18.50 Камэдыя «Чаго хочуць жанчыны».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Прафэсійны бокс. Відэаагляд.
22.45 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

### ● ЛАД
8.05 Мультыклюб.
9.00 «Не зявай!».
9.40 «Мір вашаму дому».
9.50 Маст. фільм «Грэшніца». 2-я сэрыя.
10.55 «Сад мары».
11.20 «Ідзі туды — ня ведаю куды», «Балерына на караблі». Мультфільмы.
12.30 Мультсэрыял «Трышчан ды Іжота — забытая легенда».
12.55 Любімыя казкі. «Залаты ключык».
14.15 Сэрыял «Вершнікі з паданьняў».
14.45 «Бюро знаходак».
15.10 «Сьвятло далёкай зоркі. Нэлі Тулупава».
15.35 Дак. сэрыял «Мастакі». Заключная сэрыя.
16.05 Сэрыял «Адвакацкая кантора». Заключная сэрыя.
16.55 «Імгненьні вечнасьці».
17.15 Плошча мастацтваў.
17.40 Сэрыял «Бацькі й дзеці».
18.50 Дэтэктыў «Мёртвы сэзон». 2-я сэрыя.
20.00 Навіны.
20.10 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
20.25 Камэдыя «Тры жанчыны і мужчына».
21.55 Камэдыя «Нармандзкая дзірка».

### ● СТВ
6.30 «Дзікая плянэта»: «Белавескія зубры». Дак. фільм.
7.25 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Сэрыял.
8.40 «Кіно — дзецям»: казка «Каменная кветка».
10.00 «СТВ-спорт».
10.10, 20.55 «Аўтапанарама».
10.35 «Вялікае сьнеданьне».
11.00 «Менск і менчукі».
11.10 «Сьвецкая хроніка».
11.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.35 «Пульс плянэты».
11.45 «Лёсу свайго гаспадыня».
12.5. 23.45 «Бафі». Сэрыял.
12.50 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: трылер «Глядыятар-найміт».
15.05 Праект «Адлюстраваньне»: «Лёд». Дак. фільм.
16.10 «Найлепшыя шоў сьвету».
17.10 «Клясыка гумару».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
19.50 «Асабісты інтэрас».
20.25 «Пакуль гарыць сьвечка...».
21.20 Турпаход.
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: драма «Патрыёт».
23.30 «Навіны СНД».

### ● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб. «Геркулес».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Розыгрыш прызоў ад «Coca-Cola».
10.20 «Падарожныя нататкі».
10.40 Пакуль усе дома.
11.20 «Угадай мэлёдыю».
11.50 «Ералаш».
12.10 «Справа «Апалён». Ці былі амэрыканцы на Месяцы?». Дак. фільм.
13.00 Хакей. Міжнародны турнір «Кубак «Балтыкі». Зборная Расеі — зборная Чэхіі.
15.10 Дыснэй-клюб. «Мікі Маўс і яго сябры».
15.35 Ток-шоў «Выбар».
16.20 Сьмехапанарама.
17.00 «Вялікія бацькі».
17.30 Жывая прырода. «Прагулкі з марскімі пачварамі», «Сьляды нябачаных жывёл».
18.35 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга. Першы паўфінал.
20.30 Контуры.
21.20 Баявік «Дэтэктыў Шафт».
23.20 Канцэрт Пола Макартні на Краснай плошчы.

### ● РТР
9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 «Стварыць «Групу «А». «Уфімскія пярэваратні». Частка 2-я.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Золата партыі».
15.00 «Мікіта Міхалкоў. Расейскі выбар». Генэрал Дзянікін.
15.55 Пакой сьмеху.
16.55 Маст. фільм «Конга».
18.50 «У Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.00 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.25 Маст. фільм «Брат».

### ● НТВ
9.10 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.20 «Апэльсынавы сок».
10.55 Гуляем у «Кено».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Усё адразу!
12.05 Маст. фільм «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталіным».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.15 «Іх норавы».
16.05 Баявік «Шалёная баба».
18.00 Камэдыя «Анёл помсты».
20.00 «Надоечы».
21.30 Дэтэктыў «Віза на сьмерць».

### ● Эўраспорт
9.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Энгельбэрг. К-120. Паўтор.
10.45 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Гіганцкі слалам. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
11.45 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Гіганцкі слалам. Жанчыны. Лаакс. Жывая трансьляцыя.
13.00 Біятлён. Жывая трансьляцыя.
14.45 Горныя лыжы.
15.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Энгельбэрг. К-120. Жывая трансьляцыя.
16.45 Бабсьлей. Кубак сьвету. Чацьверка. Мужчыны. Альтэнбэрг. Жывая трансьляцыя.
18.00 Біятлён. Паўтор.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Энгельбэрг. К-120. Паўтор.
21.00 Індор-трыял. Чэмпіянат сьвету.
22.00 Конны спорт. Спаборніцтвы ў канкуры. Лёндан.
23.00 Конны спорт. Спаборніцтвы ў канкуры. Лёндан. Жывая трансьляцыя.
0.15 К-1. Гран-пры. Токіё. Осака. Паўтор.

Зьміцер Вайцюшкевіч

**Паравіны году**




...вытрыманая да драбніц стылёвасьць, вытанчанае гучаньне, рытмы клясычных танцаў...

*Уражаны Слухач*

Пытайцеся гэты сапраўдны калядны падарунак у дыскарнях Вашага гораду

# Рэстаўрацыя фантома



Частка нацыянальнае інтэлігенцыі гатовая дараваць прэзыдэнту Беларусі дыктатарскія замашкі, парушэньне правоў чалавека і нават грэблівае стаўленьне да самой інтэлігенцыі толькі таму, што ён стаіць на чале такой выпакутаванай дзяржавы.

«Есть у революции начало, нет у революции конца!» Гэтак, даволі легкадумна, сьпявалася ў старой савецкай песеньцы. Але нават і савецкаму чалавеку было зразумела, што ў рэвалюцыі, у адрозьненьне ад эвалюцыі, заканчэньне мае быць. І чым больш бурлівая рэвалюцыя, тым больш хуткім будзе яе завяршэньне. Але застаецца пытаньне, якое хвалюе кожнага нармальнага грамадзяніна: чым яна завершыцца? Мірнай трансфармацыяй грамадзтва, як у выпадку «аксамітнай рэвалюцыі» ў Чэхіі або «сьпеўнае рэвалюцыі» ў Эстоніі? Чым скончыцца «рэвалюцыя ружаў» у Грузіі, мы ўвогуле пакуль ня ведаем. Але ў кожным выпадку, мірныя рэвалюцыі выглядаюць выключэньнем у гісторыі XX ст.

Часьцей за ўсё рэвалюцыя або адразу церпіць паразу (і тады яе называюць бунтам), альбо праз некаторы час пераходзіць у контррэвалюцыю. Гэта сіямскія блізьнюкі, часам іх нават цяжка адрозьніць: ці быў Сталін контррэвалюцыянэрам у адносінах да рэвалюцыянэраў Леніна й Троцкага? А ці былі правадыры пралетарскай рэвалюцыі контррэвалюцыянэрамі ў адносінах да Часовага ўраду? Куды больш для вызначэньня працэсу падыходзіць слова «рэакцыя». У тым сэнсе, што кожнае дзеяньне сустракае процідзеяньне. Чым больш «мяккая» рэвалюцыя, тым менш бурная наступае рэакцыя.

Найбольш вядомая назва палітычнай рэакцыі — рэстаўрацыя. Нарадзілася яна ў Францыі пасьля вяртаньня Бурбонаў на каралеўскі трон у сярэдзіне XIX ст. Гэтую падзею арыстакратыя пышна сьвяткавала ў парыскіх рэстарацыях. Лідэры расейскіх ЛДПР і блёку «Радзіма» мала чым нагадваюць францускіх арыстакратаў, але шампанскае ў штаб-кватэрах гэтых арганізацыяў на выбарах 7 сьнежня, пэўна, таксама лілося ракой. Для многіх у Расеі гэтая дата выбараў мела сымбалічны сэнс. Бо 8 сьнежня 1991 г. былі падпісаныя Белавескія пагадненьні, якія расейскія патрыёты дагэтуль успрымаюць як нацыянальную катастрофу.

Праз дванаццаць гадоў, 7 сьнежня 2003 г., у Расеі адбылася мяккая контррэвалюцыя. Контррэвалюцыяй выбары ў дзяржаўную Думу можна назваць толькі ў той ступені, у якой падзеі 1991—93 г. можна называць рэвалюцыяй. Расейскія дэмакраты нічога не дасягнулі, бо працэс распаду імпэрыі ад іх не залежаў. Але на гэта можна запярэчыць, што рэвалюцыі ніколі цалкам не дасягалі сваіх мэтаў. Асабліва ў пляне стварэньня. Вось у пляне разбурэньня рэвалюцыянэры заўсёды перабіралі цераз край.

Рэвалюцыя ў Расеі гэтым разам абышлася безь вялікай крыві (хоць людзкія страты кастрычніка 93-га дагэтуль дакладна невядомыя). Адпаведна, перамога контррэвалюцыі ў 2003-м таксама далася малой крывёю. Нават адміністрацыйны рэсурс партыі ўлады быў выкарыстаны вельмі памяркоўна: Крэмль задаволіўся 37% «адзінаросаў», бо ўсе астатнія партыі, якія прайшлі ў Думу, назваць апазыцыйнымі рызыкне хіба адчайны фантазёр. Гэтым разам не спатрэбіўся нават матрос Жалязьняк. Пракурор Усьцінаў, які адправіў у «Матроскую цішыню» Хадаркоўскага, на ролю Вышынскага ня цягне, як і Хадаркоўскі ня цягне на ролю Бухарына, а Касьянаў — Рыкава.

Нельга забывацца пра Чачэнію. Вайна на Каўказе прынесла дзясяткі тысячаў ахвяраў з абодвух бакоў, сярод якіх і ахвяры апошніх тэрактаў у Есентуках і Маскве. Але расейскае грамадзтва дагэтуль не жадае ўспрымаць гэтую вайну як факт унутрырасейскага жыцьця. Грамадзтву здаецца, што вайна ўсё яшчэ адбываецца недзе там, на ўскраіне імпэрыі, дзе зухаватыя расейскія хлопцы змагаюцца із «злымі чачэнамі». Больш за тое, грамадзтву аднойчы прымроілася, што яно жыве ў імпэрыі: хай сабе саслабленай новымі «гунамі», але ж нязломнай, гатовай адрадзіцца як птушка Фэнікс. Савецкага Саюзу вось ужо 12 гадоў як няма, але імпэрская сьвядомасьць засталася. Гэта як фантомны боль. Бывае, што чалавеку лекары адрэзалі нагу, а яму ўсё здаецца, што яна начамі баліць.

Імпэрыі ня гінуць у адзін момант. Барбары заваёўвалі Рым не аднойчы, перш чым ён перастаў лічыць сябе Вялікім Рымам. Захопнікі прызначалі сябе ня кім іншым, як рымскімі імпэратарамі, а самі яны лічылі сябе спадкаемцамі Рымскай імпэрыі. Імпэрыі, заўважце, а не Рэспублікі, Сэнату й Рымскага права — усяго таго, без чаго няма заходняй цывілізацыі. Расейскі пісьменьнік Віктар Ерафееў падчас начных пасьлявыбарных дэбатаў на канале НТВ паставіў дыягназ: расейскі народ прагаласаваў супраць цывілізацыі.

Прэзыдэнт Беларусі заявіў аднойчы, што ён свой народ за цывілізаваным сьветам не павядзе. Прэзыдэнту Расеі — палкоўніку КГБ — нічога не давялося тлумачыць: ягоны народ яго зразумеў з паўслова. Дакладней, з паўфразы: «…мачыць у сарціры!» Калі прэзыдэнту Беларусі нехта процістаўляе прэзыдэнта Расеі — маўляў, ён самога «бацьку» ўмыў, успамінаецца адзін амэрыканскі раман. Там кандыдат у губэрнатары так аблаяў нейкага паліцэйскага, што заслужыў «камплімэнт» ад сваёй жонкі: перахаміў хама.

Уражвае вось што: так званая лібэральная расейская інтэлігэнцыя выступае ў абарону Пуціна. Прэзыдэнт аўтарытарнымі мэтадамі ратуе еднасьць Расеі, клапоціцца пра будучыню краіны і яе «асаблівы шлях».

Гэтаксама частка беларускае нацыянальнае інтэлігенцыі гатовая дараваць прэзыдэнту Беларусі дыктатарскія замашкі, парушэньне правоў чалавека і нават грэблівае стаўленьне да самой інтэлігенцыі толькі таму, што ён апынуўся на чале выпакутаванай незалежнай дзяржавы. Выстройваецца няхітрая лягічная канструкцыя: чым мацнейшы будзе дзяржаўны апарат на чале з кіраўніком дзяржавы, тым большыя будуць гарантыі незалежнасьці краіны. Проста і ясна, як прэзыдэнцкая вэртыкаль: дзяржава будуецца зьверху ўніз і сама па сабе ёсьць найвышэйшай каштоўнасьцю. Дэмакратыя й правы чалавека, нацыянальная культура й саматоеснасьць увогуле каштоўнасьцямі не зьяўляюцца, паколькі дзяржава можа існаваць і бязь іх. Інкі ці ацтэкі цудоўна абыходзіліся без усяго гэтага, а іх імпэрыі існавалі вякамі.

Выбар паміж правамі нацыі й правамі чалавека — гэта поўная адсутнасьць права выбару, безумоўнае падпарадкаваньне дзяржаве. Могуць запярэчыць, што амаль усе эўрапейскія краіны, якія набылі незалежнасьць пасьля першай сусьветнай вайны, хутка зрабіліся аўтарытарнымі — ад Балтыі й Польшчы да Вугоршчыны й Румыніі. (Чэхія тут выглядае выключэньнем.) Маўляў, час вымагаў прыходу моцных, аўтарытарных асобаў, здольных згуртаваць нацыю, — такіх, як Пілсудзкі, Сьмятона ці Ульманіс. І што, дамарослы фашызм гэтым краінам дапамог? Савецкая акупацыя балтыйскіх краінаў зьмянілася нямецкай, потым зноў вярнулася савецкая. А вось Вялікая Брытанія, дзе фашыстаў на чале з тамтэйшым фюрэрам Мосьлі рэгулярна білі на вуліцах абываცелі, ня проста выстаяла — дзякуючы намаганьням Чэрчыля ўдалося стварыць антыгітлераўскую кааліцыю і разам з ЗША ды СССР перамагчы Трэці райх. А потым і спыніць наступ камунізму ў Эўропе. У прэм'ера Чэрчыля былі вялікія паўнамоцтвы, але ён кіраваў не дэкрэтамі і ў яго ніколі ў думках не было ні абмяжоўваць правы парлямэнту, ні зачыняць партыі або газэты.

Менавіта падчас другой сусьветнай вайны, на схіле бліскучай кар'еры, суайчыньнік Гітлера псыхааналітык Зыгмунт Фройд прыйшоў да высновы, што культура фармуе толькі самы верхні і самы тонкі слой чалавечай асобы. У экстрэмальных, нечалавечых умовах гэты слой лёгка разбураецца і на паверхню выходзяць дагістарычныя інстынкты гома сапіенса — істоты злоснай, хцівай і бязьлітаснай.

Паліттэхнолягам Расеі ўдалося выкарыстаць гэтыя інстынкты, якія ў часткі насельніцтва, што жыве па-за рысай беднасьці, вырваліся вонкі — пра гэта сьведчыць высокі працэнт галасоў у жырыноўцаў і рагозінцаў. Аднак у паразе «Яблыка» і СПС ёсьць і станоўчыя моманты. Візыт Нямцова ў Менск, які разглядаўся ледзьве не як галоўная сэнсацыя напярэдадні выбараў у Расеі, цяпер стаўся гістарычным анэкдотам. Важна, каб ілюзіі наконт дэмакратычных пэрспэктываў Расеі як мага хутчэй разьвеяліся ня толькі ў расейскіх правых, але найперш у дэмакратычных сілах Беларусі. Дэмакратыя ў Беларусі патрэбная не расейцам і нават ня Захаду. Яна найперш неабходная самім беларусам. Каб выжыць.

**Віталь Тарас**

## Гадавіна Слуцкага паўстаньня ў Лёндане

**22 лістапада Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі (ЗБВБ) адсьвяткавала ў Лёндане 83-ю гадавіну Слуцкага паўстаньня.** Айцец Аляксандар Надсан у царкве Сьв.Апосталаў Пятра і Паўла адслужыў жалобную багаслужбу за паўстанцаў і ўсіх ахвяраў, якія загінулі з рук акупантаў у змаганьні за незалежнасьць Беларусі. Пасьля багаслужбы прысутныя сабраліся ў залі Рэлігійна-культурнага цэнтру. Спадарыня Л.Міхалюк, Старшыня Ўправы ЗБВБ, афіцыйна адкрыла вечарыну. Ад імя Ўправы яна прывітала вялікую грамаду, якая прыбыла з усіх куткоў Англіі, і паважаных гасьцей зь Беларусі ў асобах Уладзімера Арлова і Зьмітра Бартосіка.

Пасьля хвіліны цішыні ў памяць тых, што паклалі свае жыцьці за Беларусь, слова ўзяў сакратар ЗБВБ М.Пачкаеў. Ён прачытаў прывітаньне прысутным ад старшынькі БНР спадарыні Івонкі Сурвіллы, беларускіх арганізацый з Аўстраліі, Амэрыкі і сяброў з паўночнай Англіі, якія з асабістых прычын не змаглі прыбыць на сьвяткаваньне.

Рэфэрат пра Слуцкае паўстаньне прачытаў сп.Арлоў. На пытаньне, што сталася з тымі паўстанцамі, якія засталіся жывыя, адказ: большасьць іх бальшавікамі была расстраляная або вывезена ў сібірскія лягеры. Вечарына скончылася сьпяваньнем гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», які выканаў Зьміцер Бартосік. З гітарай ён прасьпяваў многа песьняў пра слуцкія падзеі і цяперашняе жыцьцё ў Беларусі. Кожная яго песьня была вітаная гучнымі апладысмэнтамі.

На канец канцэрту спн.Міхалюк ад імя прысутных падзякавала спадарам Арлову ды Бартосіку і ад імя Ўправы ўручыла абодвум падарункі. Атрымаў падарунак і айцец Надсан, які 23 лістапада меў сьвяткаваць 45-ю гадавіну сьвятарства. Прысутныя гучна адсьпявалі айцу «Доўгія гады, Доўгія гады плённага жыцьця».

Сяброўкі ЗБВБ прыгатавалі багаты пачастунак. Пры чарцы віна і добрай закусцы хутка праляцеў час, і зноў трэба было разьяжджацца да розных куткоў Англіі.

Жыве Беларусь!

**Сыльвэстар Будкевіч, Англія**

## І складкі браць

**У Беларусі сыстэматычна закрываюцца грамадзкія арганізацыі.** Але, каб прыстойна выглядаць у вачах міжнароднай супольнасьці, улады вырашылі захаваць іх кольказсьць за кошт стварэньня сваіх «кішэнных» арганізацый. Адноўленая дзейнасьць таварыства «Веды», раённае аддзяленьне якога ня так даўно створана ў Глыбокім. Застаецца толькі аднавіць Таварыства кнігалюбаў, Таварыства сяброў прыроды і г.д. А складкі зь сяброў браць проста падчас выдачы заробку, як было ў савецкія часы. А калі хто ня згодны, дык, як у савецкай камэдыі, «адключым газ».

**Зьміцер Лупач, Глыбокае**

## Апытаньні сумнеўныя

**Час ад часу на старонках «НН» сустракаюцца матэрыялы, дзе паважаныя людзі, як, напрыклад, праф.Хадыка (№41), усур'ёз аналізуюць вынікі апытаньня «Ці Вы за аб'яднаньне з Расеяй?»** Ня варта разьдзьмухваць з мухі слана. Хоць вялікі ўплыў тут робяць расейскія тэлеканалы і пазыцыя Пуціна, які для большасьці людзей старэйшага пакаленьня фігура больш уплывовая, чым Лукашэнка. Прэзыдэнт Расеі бесьперапынку сьцьвярджае, што наш «зайчык» нічога ня варты. Як і Беларусь без Расеі. Для разбурэньня стэрэатыпаў патрэбнае ўласнае інфармацыйнае поле. Таму стварэньне новых каналаў (АНТ, «ЛАД» ды ў бліжэйшай будучыні «Белаcпорт») павінна толькі вітацца.

У прамовах Рыгоравіча з кожным днём усё меней месца адводзіцца інтэграцыйнай рыторыцы. І што Беларусь рыхтуецца да рынкавых цэнаў на газ, адмоўна адаб'ецца на стварэньні «Саюзу», бо большасьцю прыхільнікаў інтэграцыі Расея разглядаецца выключна як пастаўнік танных энэрганосьбітаў. А пры іх адсутнасьці на якую трасцу патрэбнае аб'яднаньне?

Лукашэнка ня можа павярнуцца тварам да Эўропы, аднак, што б ні казалі, ён рыхтуе пляцоўку для пераемніка. Бо разумее ня горш за нас, што «Беларусь — у Эўропу» — гэта непазьбежна. Таму раю меней увагі засяроджваць на выніках сумнеўных апытаньняў.

**Адась Галубовіч, Барысаў**

## Віншаваньні з Канады

**Я атрымаў ліст зь Вілейкі. Юнак пасьля прачытаньня маёй кнігі «Ўсякая ўсячына» пытаецца: «Ці зьвяртаецца да Вас канадзкая моладзь як да пісьменьніка, як да беларуса?»** Адказваю: канадыйская моладзь мала або нічога ня ведае пра Беларусь. Найбольш даведалася прыпадкова, калі дружына беларускіх хакеістаў падчас зімовай алімпіяды перамагла швэдаў. У гэты дзень разьлеглая Канада знайшла новы, дагэтуль малавядомы ёй народ і славіла ягоную хакейную дружыну. Карэспандэнты шукалі ўсюды беларусаў, каб сьвяткаваць перамогу над швэдамі. Я меў шмат званкоў. Запрашалі газэтныя карэспандэнты. Пыталіся, дзе ў якім таронцкім бары беларусы п'юць піва.

Сёлета Згуртаваньне Беларусаў Канады сьвяткуе 55 гадоў жыцьця, працы і аб'яднаньня актыўных нашых сыноў і дачок, што некалі пакінулі «раскіданыя гнёзды», каб змагацца за вызваленьне Беларусі з маскоўскага ярма і аднавіць дэмакратычную Беларускую Народную Рэспубліку.

Суродзічам у Беларусі жадаю добрага здароўя, радасных Калядаў, шчасьлівага Новага году.

Жыве Беларусь! З Богам!

**Кастусь Акула, Таронта**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

**У артыкуле «Лангбард у Бэрэнса ня краў» (№45)** замест «…запрашае чытачоў да далейшай непавагі да творчасьці архітэктараў, якой і так у нас не хапае» трэба чытаць «…запрашае чытачоў да далейшай непавагі да творчасьці архітэктараў, якой і так у нас хапае». Перапрашаем.

Аўген Цумараў

# Гасьціна ў айца Ўладзіслава

Раньняй вясною 1986 году ў Вішнева, з папярэдняй згоды айца Ўладзіслава Чарняўскага, завітаў мастак-мянчук Алесь Цыркуноў, дачка якога, дарэчы, у той змрочны для беларускага школьніцтва час вымушана была навучацца ў прыгараднай беларускамоўнай школцы на Ракаўскай шашы, «накручваючы» штодня туды-сюды па 30 кілямэтраў у перапоўненых прыгарадных аўтобусах.

Мастак пісаў алеем партрэт айца Ўладзіслава, які мусіў з гэтай нагоды час ад часу пазаваць, не перапыняючы, між іншым, свае казані: пра чалавечае жыцьцё, пра Бога, пра лёс беларускасьці ў грамадзкім жыцьці, якое мела выключнае духоўнае значэньне менавіта ў Вішневе. Вядома, што сьвятар Чарняўскі па слова ў кішэню ня лазіў, яго выказваньні пра пэўныя падзеі і пра асобаў былі трапнымі — як кажуць, у вока.

Айцец Уладзіслаў узгадваў, як яму па пераезьдзе ў Вішнева мясцовыя ўлады «не давалі» прапіскі з маўклівай згоды біскупа дый інакш усяляк заціскалі за тое, што вёў набажэнствы па-беларуску — дарэчы, на радасьць мясцовым вернікам. Казаў, што даводзіцца ўсяляк асьцерагацца з тае прычыны, што гады ў рады робіць пераклад біблійных тэкстаў на беларускую мову ды вымушаны прыхоўваць па надзейных месцах копіі ўжо апрацаваных матэрыялаў перакладаў. Згадаў, што ў 60-я Апостальская сталіца схілялася да таго, каб надаць яму біскупскі пасад у Беларусі. Ды перашкодзілі маскоўскія ўлады, не даючы дазволу на атрыманьне візы Ватыкану, а ўлучна гэтаму відавочным было супраціўленьне з боку немалой часткі ўплывовага польскага каталіцкага духавенства...

Айцец Уладзіслаў нярэдка жартаваў са зьяваў зямнога жыцьця, кажучы, што пачуцьце гумару Творца дае найперш тым, каму нялёгка выжываць у неспрыяльным асяродзьдзі ды ў нядобрыя часы. Так, на пытаньне ў жарт, чаму курыя Ватыкану выступае супраць сужэнства сьвятароў і ці не супярэчыць гэта прыродзе і Богам дадзенай чалавечай існасьці, ён адказваў: «Бог усё ж дазволіў ксяндзам грашыць у гэтым сэнсе, але толькі адзін дзень у тыдзень. Ды не назваў Творца гэты дзень, то і даводзіцца, каб патрапіць яго запавету, не цурацца гэтае зямное справы праз усю сядзьміну тыдня...»

Алесь Цыркуноў доўга не тэлефанаваў зь Вішнева ў Менск, і аўтар гэтых радкоў выправіўся ў дарогу. Айца Ўладзіслава не было ў яго драўляным дамку. Дзьверы адчыніў мастак. Паказваў партрэт сьвятара, вішнеўскія краявіды — пэйзажы, замалёўкі тамтэйшага мураванага касьцёла. Між іншым адзначыў, што жыве як у Бога за пазухай. Паказваў сенцы, «аздобленыя» ў падстрэшшы тузінам гатункаў «пальцам пханых» кілбас ды кумпякоў. Жыві, маўляў, колькі хочаш, пішы... Памаўчаўшы, дадаў: «Скончаю працу праз тыдзень, ды ехаць шкада, бо ў гэтым мястэчку і ў гэтым доме беларускае нават паветра, сонца, людзі... Ды тут яшчэ й зямны рай».

Спадар Алесь на правах гаспадара накрываў на стол, згадваючы наказ айца Ўладзіслава: працуй, маўляў, мастак, ды не забывайся сілкавацца чым Бог паслаў. А тое, што цяпер пост, то гэты грэх я табе адпушчу, не хвалюйся, — бо беларус у гэтай краіне, каб выжыць, павінен быць моцны духам і целам.

Да сьвятара Чарняўскага завіталі на пачатку 90-х некалькі зацікаўленых асобаў. Вузкай сьцяжынай — сьлед у сьлед — праходзілі ў жытло айца Ўладзіслава. Раптам аднекуль выхапіўся сабака і добра-такі шматануў за нагавіцу сярэдняга з нас, знакамітага пісьменьніка, навукоўца і кнігалюба (меў, бадай, адну з найлепшых бібліятэк, у тым ліку літаратуры даўняга веку ды эміграцкіх беларускіх публікацый) Барыса С., цяпер нябожчыка, добрай па ім памяці.

Потым за бяседай у гасьціннага гаспадара разважалі, чаму так здарылася. Увогуле спакойны сабака аказаўся зьнятым з ланцуга, але самае адметнае ў тым, што сабакі маюць нораў кідацца альбо на першага, альбо на апошняга з групы хадакоў. Нехарактэрным паводзінам сабакі было знойдзена «жалезнае» тлумачэньне: Барыс С. толькі што быў абраны (ці прызначаны?) членам ЦК КПБ. А на той час хто толькі не чапаўся да КПСС-КПБ...

Аднойчы на «Волзе» Вярхоўнага Савету па дарозе ў Горадню, да біскупа Тадэвуша Кандрусевіча, завіталі ў Вішнева. Быў Апостальскі візытатар беларусаў замежжа Аляксандар Надсан, нябожчык айцец Ян Матусевіч ды аўтар гэтых радкоў. «Летуноў» зь Менску цікавілі пераклады Бібліі айца Ўладзіслава на родную мову, а таксама шэраг іншых пытаньняў. Аднак, як часта бывае, запомнілася зямное, чалавечае: заўсёды гасьцінны гаспадар прапанаваў з добрым пачастункам бутэльку вішнеўскага першаку, фабрычнай гарэлкі ды пляшку сапраўднага «Напалеону» (не «маладачанскага» вырабу). За гутаркай раз за разам крыху частаваліся, найбольш «Напалеонам». Нават кіроўца «Волгі» не ўстрымаўся і ўзяў на сябе невялікі грэх: «Напалеон» ёсьць «Напалеон». А.Надсан, магчыма, як падданы Яе Вялікасьці Брытанскай каралевы, рашуча адмовіўся ад каньяку, а зьлёгку пачаставаўся «вішнеўскай». Пасьля чаго папрасіў у гаспадара газэту «Звязда», закаркаваў бутэльку і паведаміў, што павязе яе ў Англію.

У дамку айца Ўладзіслава была сьвятліца, заўсёды зачыненая. У той дзень упершыню гаспадар запрасіў увайсьці ў гэтую скарбонку кнігазбораў і дакумэнтаў сьвятара-перакладчыка. Цяжка перадаць словамі ўражаньне ад убачаных стосаў старадрукаў, рукапісаў, іншых скарбаў беларускай чыннасьці ў эўрапейскім сьвеце. На жаль, цяпер невядомы лёс часткі гэтых збораў...

Айцец Уладзіслаў часта езьдзіў на ровары ў ваколіцах Вішнева (прынамсі, яшчэ ў сярэдзіне 80-х), аглядаў месцы даўніх будынкаў, зьбіраў зёлкі, якія добра ведаў. Аднойчы ў такую вандроўку ён сустрэў чараду мясцовых падлеткаў, якія кудысьці сьпяшаліся. Як звычайна, сьвятар спыніўся і пачаў распавядаць падлеткам пра валуны, расьліны, веліч і сьвятасьць жыцьця на зямлі.

Зацікаўленыя хлопцы спыніліся паслухаць. Але, здаецца, ці ня двое зь іх усё ж пабеглі сваім шляхам. І неўзабаве трагічна загінулі: капалі ў кар'еры пячору, якая абрынулася і іх засыпала зямлёю...

Ці не з таго часу бацькі тых дзетак, што засталіся жывымі, ды, бадай, усе вернікі Вішнева, сталі лічыць айца Ўладзіслава ня толькі сьвятаром, а сьвятым ад Пана Бога...

Увосень 2001-га, калі я апошні раз сустракаўся з айцом Уладзіславам у плябані касьцёлу Сьв.Сымона і Алены, сьвятар з сумам паведаміў, што імкнецца сэрцам і душою ў Вішнева, ды не заўсёды здароўе дазваляе наведваць тамтэйшых вернікаў.



Жыхары Вішнева лічылі айца Ўладзіслава ня проста сьвятаром, а сьвятым.

Між іншым сьвятар нагадаў, што колькі гадоў раней, у час гаспадарчых работ каля Вішнеўскага касьцёлу, знойдзена вельмі даўняе пахаваньне, якому сотні гадоў. Айцец Уладзіслаў тэрмінова паведаміў пра гэта таму-сяму з гісторыкаў ды археолягаў у Менск, але ніхто не прыехаў...

Між тым вядома з пэўных гістарычных крыніц, што, па-першае, каля касьцёлу хавалі толькі знакамітых асобаў, якіх за багатую гісторыю мястэчка было нямала. Вядома і тое, што апошнія свае зямныя гады непадалёк ад Вішнева ў маёнтку пана Лява Маклака самотна жыў Сымон Будны, там і памёр. І нібыта быў пахаваны каля Вішнеўскага, у той час яшчэ драўлянага, касьцёлу.

Косьці з пакуль што невядомай магілы на загад сьвятара былі перазахаваныя непадалёк — з выкананьнем адпаведнага рытуалу. Пра месца перазахаваньня цяпер, пасьля сыходу зь зямнога быцьця айца Ўладзіслава, ведаюць некалькі вішнеўскіх вернікаў. Калі дапусьціць, што гэта пахаваньне Сымона Буднага, то нельга неўзабаве прамінуць правесьці адмысловыя дасьледаваньні...

Разьвітваючыся ў той восеньскі дзень, айцец Уладзіслаў падпісаў леваруч (правая рука была часткова спаралізаваная) апошнюю на той час кнігу ўласнага перакладу «Новага Запавету» на беларускую мову.

Якраз у тыя гадзіны, калі зь зямнога быцьця сыходзіў айцец Уладзіслаў Чарняўскі, неўзабаве адчуў неспакой ды пачаў выць і скуголіць той самы сабака, які вартаваў драўляную хатку сьвятара ў Вішневе. Паводле загаду новага пробашча Вішнеўскай парафіі гэта боскае стварэньне тады ж, адразу па сьмерці сьвятара Ўладзіслава, было застрэлена...

Партрэт ксяндза Чарняўскага зь нядаўняга часу можна пабачыць каля ўваходу ў памяшканьне бібліятэкі імя Адама Міцкевіча ў будынку Чырвонага касьцёлу. Тамсама захоўваецца й частка збораў зь вялікай бібліятэкі айца Ўладзіслава. Кнігі ён падараваў касьцёлу — сапраўднаму беларускаму дому ў сэрцы беларускай сталіцы — калі пераехаў у Менск.

На партрэце айцец Уладзіслаў, якім ён быў у 1986 г., у правай руцэ трымае крыж, у левай — Сьвятое Пісьмо па-беларуску і старадаўні ключ ад Вішнеўскага касьцёлу, які, здаецца, праменіць сваю духоўную сілу незвычайным сьвятлом за сьпіною сьвятара.



# Загадка «Таварыства Ардынацка»

**Загадкавае «Таварыства Ардынацка» адыгрывае ў польскай палітыцы заўважную ролю. Настолькі заўважную, што прэзыдэнт Квасьнеўскі прымае яго кіраўніцтва часьцей, чым кіраўніцтва Саюзу лявіцы дэмакратычнай.**

«Таварыства Ардынацка» (Stowarzyszenie Ordynacka) было створанае на пачатку 2001 г. былымі сябрамі Аб'яднаньня польскіх студэнтаў (АПС), што існавала ў апошняе дзесяцігодзьдзе ПНР. Уласна Ардынацка — гэта невялікая вуліца ў цэнтры Варшавы, дзе месьціўся калісьці галоўны офіс АПС, а цяпер сядзіба Таварыства.

Студэнцкае мінулае — адзінае, што яднае пяць тысячаў сяброў Ардынацкай. Сярод іх ёсьць і дзеячы ўладнага Саюзу левых дэмакратаў, і правыя з Уніі свабоды, Грамадзянскай плятформы ці «Закону і справядлівасьці». Да Ардынацкай належаць міністар замежных справаў Цімашэвіч, кіраўнік камісіі Сойму па эўрапейскіх справах Алексы, іншыя міністры, шэраг кіраўнікоў буйных дзяржпрадпрыемстваў, у тым ліку пошты, нафтавых кампаніяў і тэлебачаньня. Пасьведчаньне №1 сябра «Таварыства Ардынацка» мае прэзыдэнт Аляксандар Квасьнеўскі.

«Ардынацка яднае людзей, якія хочуць нешта зрабіць для грамадзкасьці. Арганізацыя ня можа ня быць элітнай: паводле статуту, сябрам Ардынацкай можа стаць толькі былы дзяяч студэнцкага руху, а гэта значыць асоба, якая прынамсі мае вышэйшую адукацыю», — кажа кіраўнік катавіцкага аддзяленьня Ардынацкай Ежы Возьняк.

Дзеячы студэнцкага руху ўжо на пачатку 80-х ня мелі ідэалягічных забабонаў. Яны ладзілі замежныя паездкі, стваралі прыватныя прадпрыемствы для студэнтаў. Гэтыя людзі маюць арганізатарскія здольнасьці і досьвед мэнэджэраў, але ў іх працоўных кніжках няма запісаў кшалту «сакратар ЦК». Гэта новая генэрацыя польскіх палітыкаў: прагматычная, настойлівая і «безь мінулага».

Ардынацка — не палітычная партыя, але яе ўплыў на сытуацыю ў краіне ўсё больш заўважны. Кіраўніцтва Ардынацкай некалькі разоў на год прымае прэзыдэнт. Газэты пішуць пра тое, як Таварыства, што ёсьць «нечым сярэднім паміж дыскусійным клюбам і партыяй», паўплывала на тыя ці іншыя рашэньні ўлады.

Дамінуюць у Ардынацкай левыя: 40% — сябры СЛД. Назіральнікі мяркуюць, што Таварыства можа ператварыцца ў пераемніка СЛД, які за два гады кіраваньня краінай страціў падтрымку насельніцтва. Так сябры «Салідарнасьці» й Уніі Свабоды, зразумеўшы, што наступныя выбары прайграюць, стварылі новыя палітычныя сілы — Грамадзянскую плятформу ды «Закон і справядлівасьць». Пад такімі шыльдамі правыя і трапілі ў парлямэнт у 2001 г.

Таму «Таварыства Ардынацка» ўжо пачалі называць «Плятформа Ардынацка». Кіраўнік таварыства Кшыштаф Шамалак з СЛД пярэчыць, што Ардынацка ня мае намеру ператварыцца ў палітычную партыю. Але ўжо цяпер вядома, што Таварыства створыць сьпіс сяброў, якіх будзе падтрымліваць у часе эўрапарлямэнцкіх выбараў 2004 г. Ардынацка, безь цяжару папярэдніх памылак і паразаў ды з аўтарытэтам свайго «сябра №1», мае ў гэтых выбарах добрыя шанцы.

**АДз, Варшава**

# Гудзаваты: самы багаты ў Польшчы

**Аляксандар Гудзаваты часта падкрэсьлівае, што ягоны кумір — Юзаф Пілсудзкі. У ягоным офісе стаіць бюст легендарнага маршалка. Але Пілсудзкі, як вядома, абсалютна ня верыў расейцам і лічыў іх найбольш небясьпечнымі ворагамі Польшчы. Гудзаваты ж дзякуючы гандлю з Расеяй трапіў у сьпіс самых заможных палякаў.**

У пачатку 90-х, калі расейцы былі гатовыя браць што заўгодна ўзамен на свой газ, Аляксандар Гудзаваты гэтае «што заўгодна» ім пастаўляў. З часам Гудзаваты стварыў фірму «Бартімпэкс», якая цяпер бярэ ўдзел у сумесным польска-расейскім прадпрыемстве «ЭўраПольГаз», хоць у міждзяржаўнай дамове прысутнасьць трэцяга боку ў гэтым СП не прадугледжаная.

У Польшчы амаль усе пэўныя, што Гудзаваты мае сур'ёзныя сувязі ў Расеі, толькі ніхто не бярэцца сьцьвердзіць, якія і з кім. Калі цяперашні мэр Варшавы і былы міністар юстыцыі Лех Качыньскі заявіў, што Гудзаваты разам з сваімі расейскімі сябрамі дзейнічае на шкоду польскай дзяржаве, дайшло да суду і Качыньскі вымушаны быў прасіць прабачэньня.

Аляксандар Гудзаваты мае вялізны ўплыў у краіне — некаторымі зь ягоных фірмаў (гандаль газам, страхавыя кампаніі, банкі, экспарт-імпарт) кіруюць былыя міністры і намесьнікі міністраў. Калі ў Польшчы пачалася праца над законам, паводле якога паліва для аўтамабіляў мусіць абавязкова ўтрымліваць біякампанэнты, Гудзаваты пачаў інвэставаць у прамысловасьць, якая гэтыя дадаткі выробляе. Яму было выгадна, каб працэнт дадаткаў быў ня меншы за 4,5. Сойм ухваліў 5%.

Цяпер імпэрыя Аляксандра Гудзаватага патроху адварочваецца ад Расеі ў бок ЗША. Пасьля таго як Польшча падпісала з Штатамі кантракт на закупку самалётаў F16, Гудзаваты аб'яднаў некалькі дзясяткаў фірмаў, гатовых пастаўляць свае тавары за акіян, ды гарантаваў амэрыканцам іхную плацежаздольнасьць. Узамен ён атрымае 3—5% вартасьці ўсяго экспарту ў ЗША.

Банк Эўрапейскага супрацоўніцтва, адным з уладальнікаў якога зьяўляецца Гудзаваты, даў крэдыт на будаўніцтва дому, кватэру ў якім купіў цяперашні прэм'ер Польшчы Лешак Мілер.

**АДз, Варшава**



У пачатку 90-х, калі расейцы былі гатовыя браць што заўгодна ўзамен на свой газ, Аляксандар Гудзаваты гэтае «што заўгодна» ім пастаўляў.

# Успаскіх: расейскі кандыдат на прэм'ера Літвы

Сваё багацьце, якое Ўспаскіх ацэньвае ў 20 млн даляраў, ён зарабіў на пасярэдніцтве ў разьліках Літвы за расейскі газ.



«Так, я ў нейкім сэнсе літоўскі Гудзаваты», — прызнаецца Віктар Успаскіх — расеец, які жыве ў Літве і робіць імклівую палітычную кар'еру. Назіральнікі мяркуюць, што ён можа таксама стаць «літоўскім Чарнамырдзіным».

Успаскіх, як згаданы польскі бізнэсовец і былы расейскі прэм'ер, узбраўся ў сілу дзякуючы «Газпрому». Сваё багацьце, якое Ўспаскіх ацэньвае ў 20 млн даляраў, ён зарабіў на пасярэдніцтве ў разьліках Літвы за расейскі газ.

Сёньня ён ладуе палітычны капітал на афэры вакол прэзыдэнта Раландаса Паксаса, зьвінавачанага Соймам у дзейнасьці на карысьць расейскай мафіі і схаваных за ёй спэцслужбаў. Яго створаная акурат перад выбухам «паксасгейту» Партыя працы, што абяцае народу парадак у палітыцы, дабрабыт і выгаду ў гандлі з Расеяй, сёньня самая папулярная ў Літве.

Успаскіх, які да таго ня ўдзельнічаў у канфлікце паміж парлямэнтам і прэзыдэнтам, стаў цяпер на бок Паксаса. Ён далучыўся да іншага літоўскага расейца Юр'я Барысава, які фундаваў Паксасаву выбарчую кампанію. Успаскіх запэўнівае, што ня хоча быць прэзыдэнтам Літвы, бо, як ён сьцьвярджае, «на гэтай пасадзе павінен знаходзіцца літовец». Назіральнікі, аднак, лічаць, што ён можа зрабіцца прэм'ер-міністрам. Калі гэтак станецца, яму давядзецца перавесьці гадзіньнік у сваім працоўным кабінэце. Сёньня гадзіньнік на яго пісьмовым стале паказвае ня віленскі, а маскоўскі час.

**Франц Субель**

# Курды будуюць чужую дзяржаву

**Курдзкая аўтаномія мае ўсё неабходнае для незалежнасьці, нават войска. Менавіта курдзкія пэшмэргі арганізавалі апэрацыю арышту Садама. Але амэрыканская адміністрацыя лічыць мэтазгодным далейшае сужыцьцё курдаў з арабамі ў адной дзяржаве.**




У чым розьніца паміж братам і сябрам? З дапамогай гэтага пытаньня Бруска Шавайс тлумачыць няпростае становішча свайго народу. «Брата не выбіраеш, — працягвае намесьнік камандуючага курдзкага войска. — У нас няма сяброў-суседзяў. Затое шмат братоў». Такіх, як іракцыя арабы.

Неўзабаве курдам зноў давядзецца жыць разам з братамі. Амэрыканская адміністрацыя настойвае: супольная дзяржава курдаў і арабаў мае паўстаць да сярэдзіны 2004 г. Такім чынам, Курдыстан зноў апынецца ў братніх абдымках. Амаль паўнавартасная нацыянальная дзяржава курдаў не народзіцца. Хоць на сёньня яна мае ўсё — нацыю, мову, войска, цэнтрабанк з уласнай грашовай адзінкай, парлямэнт. Больш як дзесяць гадоў іракцыя курды карыстаюцца аўтаноміяй.

Курдзкія вайскоўцы завуцца пэшмэргамі. Г.зн. «тымі, хто стаіць перад абліччам сьмерці». Амэрыканцы вымагаюць, каб пэшмэргі зьнiклі як самастойная фармацыя, стаўшы часткай новага іракскага войска. Галоўнакамандуючы курдзкіх аддзелаў пагаджаецца. «Мы выканаем загад кіраўніцтва», — кажуць байцы. Але сваё імя «пэшмэргаў» яны аддаваць не зьбіраюцца. Дый арабскае мовы байцы курдзкага спэцназу ня ведаюць. Тым ня менш, сёньня курды забясьпечваюць іракцае войска зброяй, ствараюць генштаб, дасылаюць інструктараў для вышкалу арабскіх аддзелаў.

Курдзкія банкіры даўно ўцягнутыя ў працэс рэінтэграцыі. Створаны амэрыканцамі цэнтральны банк у Багдадзе нядаўна ўвёў новыя дынары. Іх прывозяць у Эрбіль, а курдзкі цэнтральны банк разьмяркоўвае банкноты паміж банкамі. Сёньня курды карыстаюцца адначасова новым дынарам, старым з партрэтам Садама і курдзкім дынарам. Кожны плаціць чым хоча, але 15 студзеня абмен скончыцца і застанецца толькі новы дынар.

У парлямэнце Курдыстану не наракаюць. Кіраўнік фракцыі Дэмакратычнае партыі Курдыстану (ДПК) Насэк Рамазан распавядае пра бліскучую сучаснасьць, якая з волі «чужых сілаў» павінна стаць мінуўшчынай. «Наш парлямэнт рэгулярна працуе з 1998 г. З кастрычніка 2002 г. мы засядаем бесьперапынна — з прычыны крызыснага становішча». Парлямэнтары распрацавалі свой плян аб'яднаньня. Увесну курды падалі два праекты Канстытуцыі: для фэдэратыўнага Іраку і для рэгіёну Курдыстан. Рамазан лічыць: «У нас ёсьць права патрабаваць незалежнасьці. Але раз мы прыкутыя да Іраку, то найлепшым выйсьцем зьяўляецца стварэньне фэдэратыўнай дзяржавы». Як Канада ці Бэльгія.

Гэта недаспадобы арабам. Перш за ўсё традыцыйна ўплывовым арабам-сунітам, якія патрабуюць стварэньня цэнтралізаванай дзяржавы. Да гэтага ўсё больш схіляюцца і шыіты — бо тады яны будуць панаваць.

Калі праект новага дэмакратычнага Іраку праваліцца, то курды гатовыя ўзяць курс на незалежнасьць. Але, кажа Шавайс, ім не стае сяброў. Браты — іракцы, іранцы, туркі — ні перад чым ня спыняцца, каб раздушыць курдзкую дзяржаву.

**СБ; пераклад паводле «Die Zeit»**

# Айцец Генадзь Казлоўскі: Я бяруся ўзначаліць беларускую праваслаўную кангрэгацыю

**Праваслаўны сьвятар Генадзь Казлоўскі з Маларыты лічыць сёньняшнія ўмовы ідэальнымі для адраджэньня багаслужбы на беларускай мове і стварэньня аўтакефаліі. Новы Гушча ці Спасюк? Або пасланец, здольны павесьці за сабой праваслаўных?**


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**«НН»: Ойча, ці магчымае сёньня, улічваючы палітычную сытуацыю, стварэньне царквы зь беларускай мовай багаслужбы?**

**Айцец Генадзь:** У часы першахрысьціянства, калі не было ніякой юрысдыкцыі, кожную з маленькіх япархіяў ачольваў япіскап і кожная жыла незалежным жыцьцём. Колькі існуе царква на зямлі, там, дзе ўзьнікала самастойная дзяржава, праз некаторы час абавязкова ўзьнікала незалежная, аўтакефальная царква. Хоць трэба казаць — царкоўная кангрэгацыя, таму што Царква толькі адна. Дык як можа быць у нас маскоўская ці якая іншая кангрэгацыя? Гісторыя абавязкова паставіць усё на свае месцы. Вядома, што царкоўныя ўлады далёка на ўсе сьвятыя і багата дзе прысутнічалі як эмісары сваіх краін.

**«НН»: Ці цяперашнія царкоўныя ўлады наўрад ці прыхільна паставяцца да Вашае задумы.**

**А.Г.:** Шмат хто лічыць, што мітрапаліт Філарэт — толькі за расейскую багаслужбу і юрысдыкцыю. Але пасьля распаду СССР, калі ўзьнікла царкоўная кангрэгацыя Кіеўскага патрыярхату, і ў нас у Беларусі пачалося адраджэньне сваёй царкоўнай культуры. У Петрапаўлаўскім саборы пачаліся багаслужбы з элемэнтамі беларускага слова. Эвангельле зачытвалася на беларускай мове, акафістныя службы вяліся цалкам па-беларуску, нядзельная школка пры саборы была беларускамоўнай. Многа чаго было зроблена. На мой погляд, мітрапаліт Філарэт рыхтаваўся да самастойнай царкоўнай кангрэгацыі. Калі прыехаў мітрапаліт Мікалай з Канады, дык Філарэт аддаў яму сваю хатнюю царкву для служэньня. Праўда, пасьля прыезду Аляксія II, і Філарэта прымусілі высьвяціць пасьля Мікалая прастол, як пасьля нячыстага чалавека...

**«НН»: Як Вы прыйшлі да ідэі адраджэньня беларускай царкоўнай кангрэгацыі?**

**А.Г.:** Ды я ўцякаў, як мог, ад гэтай ідэі, як гэта ні парадаксальна гучыць. Пасьля распаду Саюзу Госпад наканаваў мне ўзначаліць Таварыства Трох віленскіх пакутнікаў — беларускае брацтва пры Сьвята-Петрапаўлаўскім саборы ў Менску. Далей абставіны склаліся так, што мяне выклікалі на малую радзіму і я, мнагагрэшны, цалкам аддаўся жыцьцю вясковаму. Але ж неўзабаве прыйшло запрашэньне з Украіны: ці згодныя вы прыняць манаскі пострыг і паслушэнства япіскапа, каб курыраваць сувязі паміж Украінай і Беларусяй? На мяне адразу абрынуўся цэлы шквал запалохаў з боку расейскіх сьвятароў, бо я тады быў ня ў сане. Таму я паспрабаваў схавацца ад гэтай місіі, як Іона, што вырашыў на караблі ўцячы ад Бога. Але неўзабаве зразумеў, што ад лёсу Божага не адыдзеш, і прыняў сан царкоўнай кангрэгацыі Кіеўскага патрыярхату.

**«НН»: Як Вы зноў апынуліся ў Беларусі?**

**А.Г.:** У хуткім часе паўстала пытаньне аб узьвядзеньні ў вышэйшую царкоўную годнасьць — архіярэйскую, і мяне з гэтай мэтай накіравалі ў Менск, якраз на 10-я ўгодкі чарнобыльскай навалы. Усё было добра, можна было б пачынаць стварэньне аўтакефаліі: нам у той год быў прыдадзены храм, хор... І вось адбылася спроба першага богаслужэньня, дзе былі толькі прадстаўнічыя людзі... Там высьветлілася, што сьвятар Пётар Гушча цалкам не гатовы да беларускага богаслужэньня. Ці ён усё забыўся, ці ён ня ведаў... Гэта стала вядома ў СМІ. У выніку мы засталіся ўдвух з архіяпіскапам Юр'ем Рыжым, які ні ў чым ня браў удзелу, проста сядзеў. Вёў службу ўвесь час я адзін. Тады я зразумеў, што мы зусім непадрыхтаваныя. І я не зьвіўся на прызначанае богаслужэньне, калі меркавалася высьвяціць архіярэяў. Я вырашыў чакаць далей — згодна са словамі Эвангельля: калі будзе на тое Боская воля, то яно выстаіць, як не — хутка прыйдзе ў занепад.

**«НН»: І ці была на тое Боская воля?**

**А.Г.:** Летась усё цалкам было зруйнавана, нічога ад іх не засталося. Людзі чакаюць. Усё сьвядомае беларускае хрысьціянства прагне, каб мець штосьці сваё, незалежнае. Шмат хто проста кажа: да іх, да маскоўскіх, мы ня пойдзем. Шмат хто нехрышчоны з той жа нагоды. Але я бяруся ўзначаліць беларускую царкоўную кангрэгацыю, бо мне падаецца, што ніколі не было такіх канструктыўных умоў для яе стварэньня, як цяпер.

**Гутарыў Анатоль Івашчанка**

...прыйшло запрашэньне з Украіны: ці згодныя вы прыняць манаскі пострыг і паслушэнства япіскапа, каб курыраваць сувязі паміж Украінай і Беларусяй?

## Калодзеж, калодзеж...

**Ледзь ня скончыўся трагедыяй для жыхара Астраўца «паход» па ваду.** Калі чалавек даставаў з калодзежу ваду, то адарвалася вядро. На пачатку ён спрабаваў дастаць вядро сам, але зваліўся ў калодзеж. Адтуль давялося выбірацца пры дапамозе супрацоўнікаў райаддзелу МНС. Не абышлося й бязь лекараў.

## Сем першапраходцаў

**Прыкладна год таму сем прадпрымальнікаў аб'ядналі свае сродкі і намаганьні для будаўніцтва ў Астраўцы невялікага гандлёвага цэнтру.** Ідэя зыходзіла ад прадпрымальніцы Ганны Варэйкі. У студзені цэнтар прыме першых пакупнікоў. Акрамя крамаў з прадуктамі, прамысловымі таварамі, тут будзе і кавярня.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## Падатак на коней

**Паўсотні жыхароў вёскі Брожа Бабруйскага раёну абурыліся рашэньнем райсавету аб увядзеньні дадатковага мясцовага падатку.** Згодна зь ім, уладальнікі коней павінны плаціць па дзьве, а ўладальнікі трактароў — да пяці базавых адзінак. Аб гэтых крыўдах сяляне напісалі прэзыдэнту.

**Віктар Качан, Бабруйск**

## Міліцыя з пустым бакам

**Запазычанасьць бабруйскай міліцыі за паліва дасягнула 130 млн руб.** У Першамайскім раёне праз недахоп бэнзіну на патруляваньне выяжджаюць два аўтамабілі замест васямнаццаці.

**Людміла Кокаш, Бабруйск**

## Хаўтуры для Ізраілю

**Намесьніца дырэктара Баранавіцкай мэдычнай вучэльні ўлетку «па блаце» выпісала для сваёй знаёмай пасьведчаньне аб сьмерці яе мужа.** Знаёмая тая нядаўна зьехала ў Ізраіль, дзе плацяць грошы за памерлых сужэнцаў. На гэтым цётка і зьбіралася зарабіць. Але ўлады Ізраілю вырашылі пераправерыць інфармацыю. Высьветлілася, што 34-гадовы «нябожчык» дасюль жыве ў Койданаўскім раёне і нават ня ведае, што былая жонка зьбіралася справіць па ім хаўтуры. Супраць аўтаркі «пахаронкі» пракуратура распачала крымінальную справу.

**Руслан Равяка, Баранавічы**


АЛЯКСАНДАР ШКУТ

# Бандарэнка з пункту за танкам

**Ці можа чалавек адзін зьмяніць духоўнае жыцьцё свайго гораду? Гамяльчук Андрэй Бандарэнка даказаў — так!**

Пасьля ганебнага рэфэрэндуму 1995-га многае з даробку беларускае культуры не магло дазодзіць да спажыўца праз дзяржаўныя каналы. І сёньня кнігарні не бяруць на рэалізацыю *непажаданыя выданьні*. Толькі незалежны распаўсюд дае ім магчымасьць сустрэцца із спажыўцом.

У Гомелі пачатак традыцыі гэткага распаўсюду зьвязаны з імёнамі моладзевых лідэраў Аўгена Касьцюшкі і Алеся Карніенкі. Добрую працу зрабіў і стацыянарны пункт продажу пры аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў Абласное бібліятэкі. Тамака ў 1996—97 г. беларуская культурная прадукцыя рэалізоўвалася ў рамках праекту БГФ «Наша Ніва». А цяпер самым дзейсным у распаўсюдніцкай сфэры ё Андрэй Бандарэнка. Менавіта на ягоны *пункт за танкам* штонядзелю імкнуцца гамельчукі, прагныя да кніжных і музычных навінак.

Спадар Бандарэнка — ураджэнец Гомелю. Яму троху за трыццаць. Захапленьне Беларушчынай прыйшло да яго на пачатку 1990-х праз газэты «Наша Ніва» ды «Свабода». Між тым папярэдняе выхаваньне ў Рэчыцкай школе-інтэрнаце для дзяцей з слабым слыхам было чыста савецкага духу. Распаўсюдніцкай дзейнасьцю Андрусь актыўна заняўся ўзімку 2000-га. Спачатку на рэалізацыю браў адно прадукцыю «Беларускага відэаклюбу». Паступова асартымэнт пашырыўся на аўдыёкасэты і кампакты, кнігі і часопісы. «Чакаў, можа, хтосьці іншы возьмецца за сталую рэалізацыю культурнай прадукцыі ў Гомелі, — кажа Андрэй. — Але ніхто гэтага не зрабіў, дык жа за справу ўзяўся я. Мне гэтая дзейнасьць дае найперш маральнае задавальненьне з таго, што грамадства купляе і спажывае беларускае. Матэрыяльны стымул ня ёсьць галоўным чыньнікам». Сп.Бандарэнка мае й някепскую працу — канструктар гандлёвае, офіснае і барнае мэблі.

Па тавар яму першы час даводзілася выпраўляцца ў Менск. Сёньня Андрэй карыстаецца паслугамі пошты. Гандаль ажыцьцяўляецца ў нядзелі на т.зв. *балцы*, ці *рынку калекцыянэраў*. Яшчэ пару гадоў таму торжышча зьбіралася ў Піянерскім скверыку за плячыма манумэнтальнага Андрэя Грамыкі. Аднак падчас рэканструкцыі скверу гарадзкія ўлады «папрасілі» калекцыянэраў. Цяпер *балка* зьбіраецца на плошчы Паўстаньня. Невядома, як доўга гэта працягнецца: на прадаўцоў пагрозьліва касавурыцца стадыён «Гомсельмаш», які зазнае перабудову. Няпэўнасьць прымушае задумацца над пэрспэктывамі.

Андрэй мае надзейных памочнікаў. Бацька, сп.Віктар, падмяняе сына, калі той ад'яжджае ў камандзіроўкі. Брат Віталь сваёй машынай прывозіць тавар, дапамагае.

Гандаль шторазу ажыўляецца із зьяўленьнем новага CD або кнігі. Але попыт прадказаць цяжка. Больш тавару прадаецца ўвосень, зімою і на пачатку вясны. Менш — у красавіку—траўні ды ўлетку.

Спадар Бандарэнка хоча зарэгістравацца ў якасьці прадпрымальніка і адчыніць уласны гандлёвы пункт. «Справа толькі ў наяўнасьці стартавага капіталу, — удакладняе Андрусь. — Акром таго тавару, які я цяпер прадаю, хачу прапанаваць гомельцам нацыянальныя сувэніры, харчовыя тавары ў беларускамоўна азддобленых пакунках». Гэта сапраўды патрэбна.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# Рэпартаж з ускрайку ночы

**Густаў Герлінг-Грудзіньскі. Наш брат — Зло** / Пераклад з польскай. — Менск: «Каўчэг», 2003.

Заўважана, што беларускі пераклад разьвіваецца хаатычна. Нехта натрапіў на тэкст, знайшоў грошы — і вось, беларусы ня маюць «Матухны Гускі», затое ёсьць стос выпадковых тэкстаў другарадных аўтараў.

Пераклад «Dzieńnika, pisanego nocą» ды іншых рэчаў польскага пісьменьніка Густава Герлінга-Грудзіньскага, які зрабіла Сьвятлана Курс, не стварае ўражаньня выпадковага. ГГГ жыў у нашых краёх (сядзеў у Гарадзенскай турме, дзе парыўся, да прыкладу, Шарамет) — аднак ня гэта сталася падставай для перакладчыцкага выбару. І нават ня тое, што аўтар нітуе нашыя землі з Эўропаю такім натуральным чынам, што белага шва ня бачна. У тэкстах ГГГ пануе, паводле яго ўласнага выразу, «права осмасу» — апісаньне мяжы, праз якую дабро робіцца злом, каханьне — абрыдлівасьцю, сьпеласьць — нямогласьцю, а жыцьцё — сьмерцю. У фізыцы «осмасам» называюць праходжаньне раствораў праз пранікальную мэмбрану — ад менш канцэнтраванага да больш канцэнтраванага. Ніхто не заўважае, дзе, як і калі раствор зьмяняе сваю прыроду. Ніхто не заўважае мэмбраны, мяжы, рубяжа, бо ён пранікальны.

Няўлоўны осмас паміж Дабром і Злом мы назіраем асабліва яскрава ў нашай частцы сьвету — назіраем стагодзьдзямі. Мы звыклі называць яго асмугай, асможай, імжой. Таму мы невясёлыя й нерашучыя, а нашую абазнанасьць памылкова лічаць талеранцыяй.

Тэксты Герлінга — гэта рэпартажы з таго месца,






куды кожны з нас хоцькі-няхоцькі прыйдзе, — зь цемры. Пісьменьнік не ўкрывае ніводнае эмоцыі, ніводнае жахлівае дэталі, для яго няма невыносных тэмаў. Але, парадаксальным чынам, чытач упэўніваецца, што цемра бывае літасьцівай, як сьвятло. Там няма нічога такога, што б не магло быць пераадолена чалавекам у хаўрусе з Богам. Хоць словаў «Бог» і «надзея» пісьменьнік амаль не ўжывае…

Гэта нетрадыцыйныя тэксты пра пахаваную жыўцом сьвятую, якую ніхто не назваў сьвятой дзеля недарэчнасьці ейнае сьмерці; пра каханьне сучасных Філямона й Баўкіды, поўнае граху й сумневаў; пра таямнічыя ўрокі Вэнэцыі; пра сучасныя ўцялесьненьні Д'ябла; нарэшце, пра Сьветлыя Каляды ў Асызы, горадзе, дзе сьв.Францішак чытаў казані птушкам.

Кнігу можна замовіць праз «Кнігі — поштай»: (029) 643-57-33, exlibris@tut.by.

**Ада Змачынская**

# Сільнова па-сярэднеэўрапейску




Гадавіна сьмерці славенскага песьняра Франсэ Прэшэрна, 8 лютага, адзначаецца як нацыянальнае сьвята паэзіі і зьяўляецца выходным днём. Пакуль мы спрачаемся, ці варта перакладаць па-беларуску «Гары Потэра», у славенскіх кнігарнях у дадатак да яго можна набыць процьму перакладаў сучасных і старажытных твораў. У двухмільённай Славеніі ладзіцца безьліч фэстываляў. Славенія спазнае для сябе Эўропу, а Эўропа зьдзіўляецца Славеніі.

Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці ў 1991-м славенцы не сумняваліся ў сваёй прыналежнасьці да Эўропы. Цяпер, стоячы адной нагой у ЭЗ, яны прыемна заклапочаныя пошукам месца ў супольнай эўрапейскай прасторы. І дзейсным сродкам абазначэньня «пасаду між народамі» выступае культура. Вось і Міжнародная літаратурная сустрэча паэтаў, пісьменьнікаў і эсэістаў «Віленіца» — падзея ў вялікай ступені іміджавая. І каб ня толькі сябе паказаць, але й іншых да таго заахвоціць.

Заснаваны пры канцы 80-х фэст спачатку меў дысыдэнцкі акцэнт і праходзіў у адной з самых глыбокіх альпійскіх пячор, ад якой і атрымаў назву. Хтоніхто з арганізатараў першых сустрэч, у часе якіх, на фоне агоніі імпэрый, абмяркоўваўся лёс Сярэдняй Эўропы, вінаваціць сучасную «Віленіцу» ў спаўзаньні да ўзроўню культурнага турызму. Творцы даўно не абмяжоўваюцца пячорай, якая стала хутчэй сымбалем. Яны падарожнічаюць з чытаньнямі па краіне, іх прымае прэзыдэнт. «Віленіца» ня страціла актуальнасьці, бо ідэя Сярэдняй Эўропы і сярэднеэўрапейскіх літаратурных узаемінаў успрымаецца сьвежа і з энтузіязмам, а ў беларускім клімаце яшчэ і захоўвае адценьне «крамольнасьці». Так што камукаму, а нам ёсьць чым уразіць «Віленіцу».

З Славеніі ў Беларусь прыйшоў зборнік твораў удзельнікаў 18-й Міжнароднай літаратурнай сустрэчы паэтаў, пісьменьнікаў і эсэістаў «Віленіца-2003». Сакральны тузін старонак вершаў у арыгінале і паславенску мае ў ім паэтка Людка Сільнова. У беларускай і славенскай мовах багата прадказальных адрозьненьняў, затое інтымныя падабенствы кшталту супольнага «у нескладовага» робяць голас паэткі пазнавальным. Трэба думаць, і славенцы зь цікавасьцю паслухалі б яе ў арыгінале...

Толькі адлегласьць у каторы раз стала для беларусаў непераадольнай. Дарога туды і назад каштуе трыста даляраў. У Славеніі пра гасьцей фэсту клапоціцца тамтэйшае Таварыства пісьменьнікаў. Паспрыяць браўся Саюз пісьменьнікаў, аднак ліст у Мінкульт з просьбай выдаткаваць грошы таемным чынам згубіўся. У выніку Людка Сільнова працягнула сумную традыцыю завочнага ўдзелу беларускіх творцаў у «Віленіцы». Зь яе папярэднікаў да «месца прызначэньня» даехаў толькі Анатоль Кудравец — і тое за славенскія грошы. Ды з Польшчы яшчэ дабраўся быў беларус — Ян Чыквін.

Непрысутнасьць беларусаў на фэсьце сярэднеэўрапейскай літаратуры — болей чым прочырк у справаздачы. Гэта страчаная магчымасьць стварыць станоўчы вобраз краіны.

**Андрэй Чык**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Ад Я да Я:** Літаратурны альманах / ГА «Воля да разьвіцьця». — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 60 с.: іл. 600 ас.

Зборнічак твораў сяброў літгуртку пры слонімскім падлеткавым клюбе «Сьвятліца».

**Беларускі археаграфічны штогоднік.** Вып. 4 / Беларускі навук.-дасьлед. ін-т дакумэнтазнаўства й архіўнай справы. — Менск, 2003. — 356 с. 100 ас.

Аўтары пішуць пра Нямецкі ордэн у беларуска-літоўскіх летапісах (Г.Сагановіч), ЛітБел (Л.Малыхіна), сфрагістыку рэлігійных установаў Беларусі часоў нямецкай акупацыі 1941—44 г. (Р.Жаўняркевіч) і г.д. Прыдбаць зборнік можна ў «Акадэмкнізе».

**Дзьмітрачкоў П. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага:** Др. палова XIII — перш. палова XVII ст.: Вучэб. дапам. — Магілёў: МДУ імя А.Куляшова, 2003. — 312 с.: іл. 530 ас.

**Кананові М. І доўжыцца ноч:** Вершы / ГА «Воля да разьвіцьця». — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 120 с. 500 ас.

Першы паэтычны зборнік аўтара.

**Марзалюк І. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфэсійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X—XVII ст.)**. — Магілёў, 2003. 300 ас.

Што колішнія беларусы думалі пра дзяржаву і яе самастойнасьць, каго лічылі «сваімі», а каго — «чужымі», як уяўлялі ідэальнага ўласьніка, якімі перакананьнямі кіраваліся ў шлюбных адносінах і як ставіліся да сэксу? Адказы даюць гістарычныя крыніцы. У «Акадэмкнізе» выданьне каштуе 8690 руб.

**Парашкоў С. Культура старажытнай Беларусі ад засяленьня да сярэдзіны XIII ст.** — Магілёў: МДУ імя А.Куляшова, 2003. — 132 с. 330 ас.

**Рублеўская Л. Сэрца мармуровага анёла:** Аповесьці, апавяданьні. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 288 с.: іл. — (Бібліятэка прыгодаў і фантастыкі). 2000 ас.

Перапляценьне гісторыі й сучаснасьці, захапляльныя сюжэты, высакародныя героі — усё гэта ў кнізе, прызначанай у першую чаргу для юнацкай аўдыторыі.

**Трансфармацыя культуры і грамадзтва беларускага Палесься: Мінулае, сучаснасьць, пэрспэктывы:** Матэр. міжнар. навук. канф. студэнтаў і асьпірантаў ВНУ, Берасьце, 15—16 сакавіка 2002 г. — Берасьце: БДУ імя А.Пушкіна, 2003. — 170 с. 100 ас.

Дасьледчыкі пішуць пра нацыянальную самаідэнтыфікацыю палешукоў, станаўленьне ўніяцтва на беларускім Палесьсі, пра «Баранавіцкую газэту» як крыніцу часоў нямецкае акупацыі ды інш.

**Дьяченко О. Пятидесятничество в Беларуси.** — Могилёв: МГУ им. А.Кулешова, 2003. — 188 с.: ил. 200 ас.

**Елатомцева И. На духовных перекрестках:** Историко-художественные очерки. — Минск: РУП «Минсктиппроект», 2003. — 176 с. 500 ас.

Аўтарка бярэ на сябе рызыку пісаць пра Карла Маркса. Бо, папершае, карані роду Маркса — у Беларусі; па-другое, гістарычна-культурныя шляхі некалі зьвялі разам продкаў Маркса й Радзівілаў; па-трэцяе, дасьледчыца здольная распавесьці пра свайго героя ў пазбаўленай палітычнай афарбоўкі форме. У «Акадэмкнізе» каштуе 4800 руб.

**Малиновский В.И. История белорусской государственности:** Учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипл. образования. — Минск: Беларусь, 2003. — 199 с. 2000 ас.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасьці выкладаецца на расейскай мове. Шмат пра што сьведчаць і назвы разьдзелаў: «Інкарпарацыя ВКЛ у Польскае каралеўства», «Беларускі народ пад уладаю панскай Польшчы», «Расейскі пэрыяд у жыцьці беларускага народу».

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Супраскае беларусазнаўства

**Сакрат Яновіч. Пад знакамі Арла й Пагоні.** — Крынкі, 2003.




Папулярная кніга пра гісторыю беларуска-польскіх кантактаў можа выкарыстоўвацца і як навучальны матэрыял па гісторыі беларускай літаратуры ды нацыянальнага руху ў цэлым. Калі выкладчыкі беларусазнаўства будуць, не афішуючы, распаўсюджваць такія выданьні між студэнтамі і школьнікамі, дык зробяць дабро для розумаў і Бацькаўшчыны. Без імпэрскіх бздураў, без постмадэрнага рэлятывізму, кніга пасьлядоўная і па-эўрапейску прафэсійна складзеная.

З асаблівай любасьцю аўтар апавядае пра нядоўгія гады перабываньня Беласточчыны пад Прусіяй між разборамі Польшчы і Напалеонам, калі ў Супраскай уніяцкай эпархіі зарунелі парасткі новае, не расейскае і ня польскае сьвядомасьці, на якіх узрасьлі «паповічы» Баброўскі, Даніловіч, Анацэвіч, Сасноўскі... Яновіч бачыць цяперашні беларускі лапік — няпоўную сотню тысяч чалавек — у Польшчы (у Эўразьвязе) новай «супраскай эпархіяй» для паняволенае беларускае нацыі.

**Сяргей Гезгала**

# Пратаколы мотальскіх мудрацоў

**Васіль Якавенка. Надлом.** — Менск, Беларускі кнігазбор, 2003.

Падзеі, апісаныя ў кнізе, адносяцца да 20—40-х. На думку аўтара, тады адбыўся «надлом» — незваротны працэс у жыцьці нацыі.

Героі чытаюць адзін аднаму газэты, а таксама «Пратаколы сіёнскіх мудрацоў» і «Майн Кампф». Часам, калі ідзе дыялёг паміж беларусамі і габрэямі, для ажыўленьня карціны распавядаюцца старыя показкі. Найбольшая мастацкая ўдача аўтара — эпізод, дзе нямецкі салдат частуе беларускую дзяўчынку шакаляткай. Дзяўчынка плача ад шчасьця. Ах! Гэты малюнак з гісторыі другой сусьветнай даўно чакаў свайго Вучэціча.

Зьяўляецца і «добры пан» Скірмунт, падобны да пэрсанажа з спаленага Гогалем другога тому «Мёртвых душаў». Гаспадарлівы і нацыянальна сьвядомы пан пераказвае ў скарочанай вэрсіі гісторыю ўтварэньня БНР паводле падручніка Вацлава Ластоўскага. А пасьля апошняга прадстаўніка буржуазнай Беларусі расстрэльваюць бальшавіцкія каты. Часам проза Якавенкі стварае ўражаньне дакумэнтальнага фільму, дзе кардонныя героі гавораць урыўкамі з патрыятычнай публіцыстыкі.

Лёсы местачковых габрэяў, беларусаў, палякаў перапляліся ў суцэльны клубок, які цяжка разблытаць. Бесстароньняя аўтарская пазыцыя магла б тут быць зразумелай, калі б гаворка ішла толькі пра асабістыя лёсы людзей, якіх вайна раскідала па розныя бакі франтоў. Але дзіўна выглядаюць заявы аднаго з герояў — габрэя Мендэля: Талмуд і «Майн Кампф» — «творы, вартыя адзін аднаго». Абедзьве навалы, якія абрынуліся на Беларусь у XX ст., — бальшавізм і фашызм — паводле аўтара, маюць адну і тую ж прычыну і крыніцу: змову вонкавых носьбітаў звышчалавечага ліха, трацкістаў, нацыстаў, увогуле «талмудыстаў».

Пярэстая чарада нацыяналістаў, камуністаў, фашыстаў і сіяністаў наводзіць на думку, што аўтар і сам ня ведае, для каго піша. Можна лічыць агульную лінію «Надлому» працягам традыцыі савецкага гістарычнага раману, такога, як «Петраград—Брэст» Івана Шамякіна. Аднак такога адчувальнага недахопу мастацкасьці і прыправы з публіцыстыкі белаэмігрантаў-чарнасоценцаў у савецкі час не дазвалялі.

**Зьміцер Серабракоў**

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

## Запісаны ўжывую




**Чацьверты альбом «Старога Ольсы» «Шлях» запісаны не ў студыйных умовах, а на выступах гурту ў Менску, Нясьвіжы й Лепелі.** «Стары Ольса» ўжывую гучыць больш разьняволена. Большасьць кампазыцыяў — без вакалу, але зь вялікай колькасьцю старажытных інструмэнтаў. Безумоўныя гіты альбому — «Літвін» і «Руявіт».

**25 сьнежня а 19-й «Стары Ольса» запрашае на Сярэднявечныя Каляды ў Моладзевы тэатар эстрады** (Маскоўская, 18а). Даведкі праз т.: 222-82-96.

**Сяргей Будкін**



## Пісьменьніца-рэкардсмэнка

**Вольга Іпатава за апошнія год і тры месяцы правяла 73 сустрэчы з чытачамі.** Гэта болей, чым якіколвек іншы пісьменьнік у Беларусі, а магчыма, і ў сьвеце.

**МБ**

Адам Глёбус

апавяданьне

# Апэратыўнік



Пятніца. Вечар. Пасьляпрацоўны эўфарычны настрой. Мужчына шпацыраваў паўз рэстарацыю «Гішпанскі куток».

Пятніца. Вечар. Пасьляпрацоўны эўфарычны настрой.

Мужчына шпацыраваў паўз рэстарацыю «Гішпанскі куток». Ніякіх пэўных плянаў ня меў, а таму ўзрадаваўся, калі сутыкнуўся з былым аднаклясьнікам. Ня бачыліся яны гадоў зь дзесяць.

— У маёй цешчы — дзень нараджэньня, я цябе запрашаю! — аднаклясьнік гэтаксама не хаваў радасьці. — Ненавіджу цешчу. Добра, што ты трапіўся на дарозе. Будзе з кім выпіць і пагаварыць за сталом.

— А хто яшчэ будзе на цешчынай пагулянцы?

— Свае. Я, ты, жонка і цешча. Пятніца. Вечар. Пасядзім, пабалдзеем.

У крамянатварай гандляркі набыўся агрномісты букет малінава-чорных цюльпанаў, і мужчыны пайшлі адзначаць цешчын дзень. Сказаць, што тая ўзрадавалася нечаканаму госьцю, будзе няпраўдаю, але асаблівай незадаволенасьці не выказвала.

Хоць закусак з прысмакамі быў поўны дом, пасьля выпітае пляшкі мужчына добра захмялеў.

Імяніньніца з дачкою сышлі спаць, а былы аднаклясьнік прапанаваў пайсьці на вуліцу і працьверазіцца на чэрвеньскім паветры. Мужчыны выйшлі ў начны горад. Ахмялелы зяць як сядзеў за сталом у спартовым строі і хатніх пантофлях, так і выйшаў на двор. Мужчына быў упэўнены, што той дойдзе да таксовачнага прыпынку і вернецца. Але зяць улез у машыну на пярэдняе сядзеньне і загаварыў да шафёра:

— Земляк, у цябе бутэлечка ёсьць? Мы тут крыху ўмазалі, а цяпер вырашылі да дзевак матануць. А без гарэлкі ў дзевак ня той смак.

— Няма ў мяне сьпіртнога, — скваплівым голасам азваўся вадзіла.

— Не пакрыўдзім мы цябе. Знойдзеш паліва, адвязеш да бл.дзей — і пятнаццаць баксаў твае. Думай, зямляк, прыкідвай.

— Грошы пакажы! — у кабіне запалілася лямпачка. Да віславусага твару паднеслася рука з вэерам даляраў.

— У бардачку вазьмі пляшку, а да натыканак тут недалёка. Бабы, скажу табе, найвышэйшага гатунку. Сам бы кож...

— Нешта твой бардэльчык не адчыняецца. Замок заклінавала.

— Быць ня можа. Дай гляну.

Віславусы пацягнуўся да бардачка. Сталёвы абрэнчык наручнікаў абхапіў ягонае запясьце, а другі такі ж самы зашчыкнуўся на стырне.

— Што, гніда, папаўся? Гарэлкай ён прыгандлёўвае, сутэнэрам падрабляе. Ты, сучы сын, ведаеш, з кім справу маеш? Га? З Апэратыўнікам. Паехалі ў аддзяленьне. Сядзеш ты ў мяне, цешчаю клянуся, сядзеш.

Мужчына зусім не чакаў такога віражу. Ён ведаць ня ведаў, што ягоны аднаклясьнік вывучыўся на Апэратыўніка. Удзельнічаць у пасадцы таксавіка за бутлегерства ён зусім не плянаваў.

— Скончай тэатар. Ідзі дамоў працьверазей.

— Не хвалюйся. Ты толькі да аддзяленьня са мной даедзеш, а там я ўсё сам зраблю. Паехалі на Карла Маркса.

Таксоўка спынілася каля параднага пад'езду высакастольнага дому. Дзьверкі можна было адчыняць. І мужчына зь неверагоднай палёгкаю вываліўся на вуліцу, бо ўсю дарогу здавалася, што побач зь ім на заднім седале сядзіць амаль празрыстая рагатая пачвара чорнасьлівовага колеру, сядзіць, маўчыць, пазірае і прыслухоўваецца. Паскардзіцца Апэратыўніку, а тым больш таксавіку мужчына не наважыўся: збаяўся, што тыя паедуць не на Маркса, а ў Навінкі — да псыхаў і дактароў, дзе і пакінуць таго, хто бачыў нячысьціка. Мужчына выбраў матэрыялістычны шлях разьвіцьця начных падзеяў.

Апэратыўнік прышпіліў затрыманага да сябе і загадаў мужчыну ісьці побач, нібыта сабаку. У сьмярдзючым памяшканьні пастарунку мужчына працьверазеў канчаткова, яму зрабілася гідка ад свайго ўдзелу ў мянтоўскіх гульнях.

— Пайду я, позна, дадому трэба, жонка хвалюецца, — схлусіў ён, бо ніякае жонкі ніколі ня меў.

— Чакай, зараз разам пойдзем, — цьвяроза і сур'ёзна запэўніў Апэратыўнік. — Сядай вось на гэтае крэсла...

Не пасьпеў мужчына апусьціцца на прапанаванае седала, як наручнікі прымацавалі яго да батарэі.

— Ты ў мяне сьведкам у справе пойдзеш, а не дадому, такі твой лёс.

— Ня пойдзе ён ніякім сьведкам, — упэўнена загаварыў таксоўшчык. — Не сфастрыгуеш ты супроць мяне справы, і ведаеш чаму? Таму што я сам у мянтоўцы дванаццаць гадоў праслужыў.

— Дык ты — мент? А я думаю, што ты такі спакойны. Я на яго абрэнчыкі, а ён хоць бы хны. Што ж ты, баця, адразу не сказаў, што ты свой?

— Паглядзець хацеў, як маладыя працуюць.

— Ну і як?

— Так, як і мы, зь сьмякалкаю. Ты свайго сябрука ад батарэі адшпілі, мулка яму ў наручніках.

Субота. Раніца. Мярзотны настрой, і галава расколваецца напалам.

Лявон Вольскі

эсэ

# Начальнікі

Мы жывём сярод рознага кшталту начальнікаў. Вялікія, сярэднія, малыя, зусім дробныя… Як у войску. Гэтыя начальнікі дзяўбуць адзін аднаго ў залежнасьці ад велічыні й вышыні пасады. Дзяўбуць, каб ніжэйшыя дзяўблі яшчэ ніжэйшых, каб ішла работа. Крычаць, выклікаюць «на кавёр», робяць вывалачкі… Але сёньня ня будзем гаварыць пра высокае кіраўніцтва, лепей разгледзім маленькіх начальнічкаў.

Вось вы заходзіце па нейкіх справах у якуюсьці ўстанову (інстытут, рэдакцыю етс.). Вас сустракае вахцёр. Гэты вахцёр — ваш часовы начальнік. Ад яго залежыць — пойдзеце вы ў ягоную ўстанову ці пашыбуеце сабе кудысьці ў іншае месца. Ніводнага разу ў маім жыцьці не здаралася, каб вахцёр канчаткова не пусьціў мяне па маіх справах на часова падначаленую яму тэрыторыю. Але нэрваў паматлялі багата. Хто, да каго, чаму ў такі час, загад дырэктара — нікога сёньня, акрамя работнікаў, не пускаць… Адзін усё любіў паўтараць:

— А што дырэктар?! Дырэктар — ён у будні дырэктар. А ў выходны дзень — я тут дырэктар. Хачу — пускаю, хачу — не пускаю.

Яшчэ быў адзін, дык той, нягледзячы на вельмі сталы век, ставіўся неабыякава да алькаголю. А працаваў ён у філярмоніі, дзе шмат хто з работнікаў таксама неабыякава ставіўся. Прыедуць людзі з канцэрту, разгрузяць свае інструмэнты й дэкарацыі, зойдуць у рэпэтыцыйную клясу, сядуць, абмяркоўваюць канцэрт, хібы й вартасьці, вып'юць па чарачцы… Тым часам вахцёр выходзіць з будынку і глядзіць, у якіх вокнах гарыць сьвятло. Тады пачынае «абыход». Дзесьці наткнецца на рэпэтыцыю, а недзе й на «абмеркаваньне канцэрту». «Ага, расьпіваем, значыцца? Нехарашо. Ну што, дакладаць дырэктару пра вашыя паводзіны ці не?» Яму наліваюць, ён сыходзіць. І гэтак пакуль усе вокны не патухнуць.

Адзін суворы адстаўнік сядзіць на КПП у адным вядомым будынку, населеным журналістамі. Яму прагягваеш прэс-карту, і кожнага разу ён гаворыць: «Гэта не паложана. Для нас гэта — не дакумэнт. Трэба пашпарт». Ты гаворыш: пашпарта няма. Ён маўчыць. Ты гаворыш, маўляў, я тады пайду па сваіх справах, бо мне гэтыя інтэрвію ня вельмі патрэбныя, скажаце потым вашым дзяржжурналістам, што не пусьцілі, бо пашпарта не было. І штораз ён гаворыць, неахвотна гэтак: «Ладна. Давайце сваю прэс-карту. Дзе тут нумар, дзе тут сэрыя?» Ты паказваеш. Гэты рытуал паўтараецца зь месяца ў месяц.

Прыбіральшчыцы. Таксама начальства.

Неяк трэба было гнаць машыну ў рамонт. Не заводзілася. Прыехаў сябар на сваёй. Зачапілі леяй. Стаіце, абмяркоўваеце, як лепей цягнуць, па якой дарозе. Непадалёк стаіць мясцовая прыбіральшчыца, начальніца двара, сьмецьцевых бакаў і сьмецьцеправодаў. Відавочна, аматарка напояў пладовых моцных. Падыходзіць.

— Забірайце машыну, бо зараз прыедзе сьмецьцявоз забіраць бакі, а вы перагарадзілі праезд.

— Дык мы ж і забіраем.

— Вы стаіце і трындзіце. Я гавару, забірайце машыну, бо я зараз паклічу міліцыю.

Далей вы на яе не зважаеце, працягваеце абмеркаваньне. А яна запальваецца ўсё болей ды болей, бегае коламі, крычыць, лаецца матам, вы ўжо селі па сваіх самаходах, сябар твой ужо завёўся, а яна ўсё крычыць, а потым бяжыць выклікаць міліцыю. Вы зьяжджаеце, шкадуючы, што не давядзецца ўбачыць прыходу міліцыянта.

А якія суворыя бываюць начальнікі ў розных канторах — ваенкаматах, жэсах, паліклініках! А ў крамах! Вось яна гаворыць: «Пакупацелі, прахадзіце, не талпіцеся тут!» І ў гэтым «пакупацелі» столькі пагарды, стольгі гідлівасьці да гэтых людзей другога гатунку, што вечна лазяць, вечна хочуць есьці, вышукваюць штосьці сярод малака-кефіру-тварагу…

Адзін знаёмы прыйшоў у краму з малой (4 гады) дзяўчынкаю. Купіў ёй марозіва. Прадаўшчыца падае яго дзяўчынцы, а тая ёй выхавана гаворыць: «Дзякую». Божа, што тут распачалося! Гандлярка (па ёй, дарэчы, адразу відаць, што ня зь Менску) уся пачырванела, пачала раўсьці: «Да што ж эта дзелаецца! Вы зачэм рабёнка калечыце?! Каму нужан этат беларускі язык?!» Знаёмы выслухаў лекцыю пра шкоду беларускай мовы, адказаў спакойна: «А мне падаецца, што нашая мова вельмі мілагучная й прыгожая». І выйшаў з крамы. Дзякаваць богу, за дзьвярыма тэрыторыя падпарадкаваньня прадаўшчыцы скончылася. Адно дзіця ўсё не разумела: што цётцы гэтак не спадабалася?




IREX-PROMEDIA

Вось так і існуем мы сярод розных начальнікаў. Зрэшты, мы ж і самі — начальнікі. Усе — начальнікі. І ўсе падначаленыя. Ад прэзыдэнта да бамжа. Сярод бамжоў таксама існуе герархія. А прэзыдэнт змушаны падпарадкоўвацца сусьветным законам. Вы скажаце: «Ён не падпарадкоўваецца!» Каб зусім не падпарадкоўваўся, дык у Менску не было б ніводнае амбасады. Гэта як кот — паддаецца дрэсуры, цяжка, але паддаецца.

Цяпер галоўнае — вызначыцца, каго ў табе болей — начальніка ці падначаленага, сфармаваць мадэль паводзінаў — і наперад, у жыцьцё. А жыцьцё стракатае, у ім здараюцца неверагодныя рэчы, усё цячэ, усё зьмяняецца, бягуць гады, прыходзіць новая, сьветлая будучыня, ты адчыняеш дзьверы гэтае будучыні, за якімі струменіць цёплае сьвятло…

І натыкаешся на вахцёра. «Вы да каго, малады чалавек?» — пытаецца ён.

# Нам такія падабаюцца

17-гадовая плыўчыха **Аляксандра Герасіменя** прызнаная беларускай «Каралевай спорту» паводле вынікаў конкурсу прыгажосьці, зладжанага Нацыянальным алімпійскім камітэтам. Фатасэсіі спартовак публікаваліся ў «Прессболе», 1366 чалавек узялі ўдзел у галасаваньні праз пошту і праз Інтэрнэт. Другое месца заняла тэнісістка Вольга Барабаншчыкава, трэцяе — гімнастка Элона Асядоўская. У свае сямнаццаць Герасіменя — трохразовая прызэрка чэмпіянату Эўропы і пераможца этапу Кубку сьвету. Але: яна ж дыскваліфікаваная на два гады за ўжываньне норандрастэрону, які ня робіць жанчыну больш жаноцкай. Тых, хто за яе галасаваў, гэта не патурбавала. Нядаўна злоўленую на допінгу Яніну Карольчык таксама толькі шкадавалі. (Гэта ўсё «нядобразычліўцы падстроілі».) Ніводная крытычнага водгуку ў прэсе. У Эўропе надзіманыя рэкорды — гэта ганьба. Там ашуканцы трацяць рэпутацыю і рэклямныя кантракты. У Беларусі ж спартоўку, злоўленую на допінгу, прызнаюць сэкс-ідалам. Герасіменя сэксуальная, так. Бо прыгожая і бо чэмпіёнка. Прычым другое ня менш важнае за першае. Прадукаваньне такіх каралеваў з дапамогай допінгу — тое самае, што расьцягваньне шыі, моднае сярод карэнскіх жанчынаў, ці бінтаваньне ног у старажытным Кітаі.


«ПРЕССБОЛ»

Аляксандра Герасіменя

## Канец эпохі Чадовіча

**Аляксандар Чадовіч**, галоўны архітэктар Менску, сышоў у адстаўку. Настаяла начальства. Гэтую пасаду ён займаў з 1996-га. Усё збудаванае за Чадовічам увойдзе ў аналы як «архітэктура часоў Лукашэнкі». Пры ім скончалі чыгуначны вакзал і Палац Рэспублікі, бурылі Дзімітрава і стары ўнівэрсытэт, ставілі ратушу. Эпоха Чадовіча запомніцца плястыкава-шклянымі лядовымі палацамі й паркінгамі, ярмошынскай пліткай, падсьветкай галоўных вуліцаў, касмадромнымі ліхтарамі на цэнтральных плошчах. Час ацэніць яго.

## Сэр Джагер

**Мік Джагер**, лідэр «Ролінг Стоўнз», сьледам за бітламі, Стынгам і Элтанам Джонам, атрымаў рыцарскія шпоры. Пасьвячаў яго прынц Чарльз, бо каралева Лізавета ў больніцы. Во дзівіліся б Плантагенэты й Цюдоры, каб дазналіся, што іх наступнікі даюць рыцарскі пас мэнэстрэлям ды блазнам.

**СМ**

# Казус бэлюм

фэльетон

Пераход Садама Хусэйна ў талстоўства — стараверская барада, сьціплыя шмоткі і тэтыка непраціўленьня гвалту — рэанімавалі ў беларускіх апазыцыйных колах хімэру імпарту дэмакратыі.

Некалькі тысяч трупаў (Іраку шлях да дэмакратыі каштаваў 25000 жыцьцяў) лічыцца прымальнай таксай, якую грамадзтва можа заплаціць за тое, каб памасажаваць вуха фразай «Лэдзіз энд джэнтэльмэнз, мы яго злавілі». Або пацешыць вока трансвэстыцкім ролікам, дзе прэзыдэнт носіць бамжовы прыкід. Для матэрыялізацыі аўдыё-відэа-летуценьняў не хапае фармальных доказаў датычнасьці Карла Маркса, 38 да тэрарыстычнае восі.

У свой час Буш і Блэр, шукаючы падставы для інтэрвэнцыі, тупа скачалі з Інтэрнэту студэнцкі рэфэрат аб быццам бы існых у Іраку распрацоўках атамнай зброі, атрымаўшы цудоўны casus bellum. Беларускую дэмакратыю, як і ірацкую, можа ўратаваць жанр horror fantasy. Прапаную свае сьціплыя паслугі ў справе стварэньня варыянту ліпы. Як вам электронная перапіска паміж Хусэйнам і кіраўніком адной усходнеэўрапейскай краіны? Тэкст перапіскі знаходзіцца на дыскеце, знойдзенай чабанам Хамзой каля Тыкрыту. Ён доўга выкарыстоўваўся ў якасьці амулету ад выбрыкаў шайтана, пакуль яе не набыў курд — студэнт-завочнік факультэту нетрадыцыйнай мэдыцыны БДУ. Дыскета трапіла ў Беларусь, дзе стала набыткам грамадзкасьці.

«То: PPRB@tut.by. Салям, Іскандэру ібн Рыгор. Выступілі ў газават супраць няверных. У атачмэнце запрашэньне на парад перамогі на Пэнсыльванія Авэню. Не забудзься ўзяць ролікавыя лыжы, каб пакатацца з Капіталійскага ўзгорку. Твой Садам.

20.04.03 То: saddam@apagay.com. Дзякуй за запрашэньне. Калі захопіце ЗША, не чапайце Памэлы Андэрсан і Сямёна Шарэцкага. Яны — мае!!!

То: PPRB@tut.by. Салям, Іскандэру. З тактычных мэтаў, мы пакінулі Багдад і перайшлі да партызанкі. Займаюся бактэрыялягічнымі экспэрымэнтамі. Маю намер скрыжаваць клептаманію і аўтызм. Дасылаю бацылы новай чумы. Ці ня мог бы ты выпрабаваць іх на вашых апазыцыянэрах?

То: saddam@apagay.com. Вітаю, Садаме. Сабраў прэс-канфэрэнцыю, прысьвечаную пытаньням прыватызацыі «Белтрансгазу», і распыліў твой Цыклён Б. Эфэкт нулявы. Раю паболей дадаць Clostridium Botulinum і мікробаў атыпічнай пнэўманіі.

То: PPRB@tut.by. Прыяжджаў Усама. Падзяліўся новым плянам — стварыць пояс шахіда даўжынёй у 42000 км. Абматаем яго вакол экватару і, замкнуўшы кантакты, зьнішчым блюзьнерскі сьвет. Ці не дапаможаш у сьвятой справе?

То: saddam@apagay.com. Дарučыў шыць пояс фабрыцы гарсэтных вырабаў «Сьнязанак». Кодавая назва праекту — «Слуцкі пояс». Будзе гатовы да Дажынак'2004. Плянэта здрыганецца ад сьвята беларускага ўраджаю!!!

То: PPRB@tut.by. У мяне выпала плёмба. Боль нясьцерпны. Больш не магу. Здамся амэрыканцам, каб трохі падлячыцца на дурня. Пішы на новы адрас: guantanamo@yahoo.com...»

Трафарэт падставы для вайны супраць менскага Чарльза Мэнсана гатовы. Плюньце мне ў акуляры, калі, прачытаўшы тэкст, Шарль, Джоні й Ганс не пагодзяцца добраахвотна несьці цяжар крыжовага паходу на РБ, аж пакуль прэс-сакратар Белага Дому ня скажа сакральную фразу: лэдзіз энд джэнтльмэнз, мы...

**Лёлік Ушкін**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### У гасьцёх у Дзеда Мароза

**25 сьнежня ў Белавескай пушчы, дзе расьце найвышэйшая, саракамэтровая, навагодняя елка Эўропы, адчыніцца рэзыдэнцыя Дзеда Мароза.** Даехаць да яе можна транспартам Нацпарку. Вазіць да Дзеда Мароза ад цэнтральнага ўваходу будуць групы, ня меншыя за дзесяць чалавек. Працаваць Калядным Дзедам мае пісьменьнік Вячаслаў Сімакоў. Асоба Сьнягуркі трымаецца ў таямніцы. Дарэчы, «Белпошта» сёлета перасылае ўсе дзіцячыя лісты Сьвятому Мікалаю ў Белавескую пушчу. Абяцаюць усім адказаць.

### Выстава Ахрэмчыка

**З 16 сьнежня ў Нацыянальным мастацкім музэі працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю народнага мастака Беларусі Івана Ахрэмчыка.** У экспазыцыі — 74 творы з фондаў музэю і сям'і майстра.

### Канцэрт Цярэшчанкі

**27 сьнежня ў Палацы вэтэранаў (Янкі Купалы, 21) адбудзецца прэзэнтацыя новага альбому легенды беларускай бардаўскай песьні Вальжыны Цярэшчанкі «Хтось крануўся крылаў».** У канцэрце таксама бяруць удзел барды-землякі Андрэй Мельнікаў і Зьміцер Вінаградаў. Пачатак а 19-й. Квіток каштуе 4500 руб.

### «Паміж» №3

**20 сьнежня часопіс «Паміж» і Беларускі калегіюм запрашаюць усіх ахвотных у Музэй кіно (Сьвярдлова, 4) на прэзэнтацыю трэцяга нумару гэтага авангарднага літаратурнага выданьня.** Імпрэза будзе мець форму капусьніку. Чакаецца прысутнасьць Андрэя Хадановіча, Віктара Жыбуля, Веры Бурлак ды інш. Пачатак а 18-й.

**ВС**

## ТАКІНДАНГ




Я ня дам сябе зьесьці!

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**Замест кветак на сьвежую магілу Клімовіч Сафіі,** памерлай у самую завіруху 6 сьнежня 2003:

Ты ня ўбачыш ужо, як зямлю сьнег пакрыў,
Не пачуеш, як вецер галосіць…
У вечным сьне тваім — жнівеньскі цёплы матыў
Й танец сьпелых жытнёвых калосьсяў.

Сьпі спакойна, любая бабуля.
Унукі і праўнукі

Рашэньнем суду Маскоўскага раёну г.Менску ад 20.06.2001 г. пастаноўлена адвакату Страмкоўскай Веры Валянцінаўне абвергнуць зьвесткі аб тым, што Смаленцаў А.М. выпіў на сваім дні народзінаў каньяк «Белый аист», канфіскаваны ў Старавойтава В.К.

**Запрашаем на калядна-навагоднюю вандроўку у Горадню 28 сьнежня (нядзеля)** з заездам у Мураванку (царква-крэпасьць XVI ст.). Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** любую жонку Галінку і даражэнькіх сыноў Якімку і Кастусіка зь 10-годзьдзем нашай сям'і. Вы мой сьвет. Сяргей

**Цёцю Нату** віншуе з Днём народзінаў любы пляменьнік Жэнька. Агу-агу?

**Былыя і цяперашнія** ліцэісты і іх выкладчыкі сьпяваюць happy birthday у гонар Наталі Водзіч

**Віншую Наталю Водзіч** — нашу надзею, іх веру, маю любоў

**11 сьнежня** — сьвята ўсіх тусікаманаў. З чым яны сябе і віншуюць

**Усе закаханыя** ў Тусіка віншуюць яе. Галоўны зь іх

**Віншуем Тусіка** з Днём народзінаў! Зычым, чаго й сама ня ведае

**Z Kaladami!** Vinšuju ūsich katalikoū!

**Віншуем** «Нулёвы Мэрыдыян» з народзінамі! Памятайце, як было 31 траўня, і рабіце шчэ лепш!

### КАНТАКТЫ

**Сьпяшайцеся** — засталося ўсяго адно кацяня: бела-чорна-плямістая котка, ласкавая, гульлівая, разумная. Т.: 251-38-75

**Хлопчык**, 17 гадоў (Вовачка), будучы мастак, паэтычная натура… Сьпіваецца. Дзяўчынкі, ратуйце! (Сур'ёзна!) Т.: 260-71-65 (пасьля 21-й)

**Шукаю** людзей, якіх цікавяць генэалёгія і геральдыка, а таксама людзей, якая маюць дачыненьне да Беларускага шляхецкага згуртаваньня. Вул.Будаўнікоў, д.15а, кв.2, 225215, Белаазерск. Дзенісеня Канстанцін

**Запрашаем** паспалітае грамадзтва на выставу «Залаты век Беларусі», прысьвечаную 450-й гадавіне Рэфармацыі ў ВКЛ, 23 сьнежня ў 17.00 у Музэй М.Багдановіча. Пагонічы

### ФОРД

**Прадам** «Форд-транзыт» 1991 г., 3500 у.а. Тэрмінова. Т.: (01591) 22-4-25

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Набуду кніжку** Антаніны Хатэнкі «З радаводу багоў паганскіх». Т.: 205-97-72

### ПАСЛУГІ

**Замоўце** новы «Siemens C55» па-беларуску і атрымайце зьніжкі. Т.: 8-029-755-68-85

### ПРАЦА

**Газэце «День»** патрабуецца дасьведчаны галоўны бухгальтар з вышэйшай адукацыяй і менскай прапіскай. Валоданьне кампутарам абавязковае. Пажаданыя веды ў галіне замежнаэканамічнай дзейнасьці. Акрамя бухгальтарскай справы неабходна часткова выконваць абавязкі офіснага мэнэджэра. Т.: 8-0296-72-70-60

**Патрэбны** настаўнік беларускай мовы двум дзеткам 4-х г. На некалькі гадзін штотыдзень. Т.: 8-029-613-70-85

**Праца**. Сталая ці дадатковы заробак. Грошы+задавальненьне. Т.: 8-029-766-12-79

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

«Наша Ніва» дзякуе за дапамогу сп.Андрэю Рубцову з Гішпаніі, М.Баяроўскаму, Г.Байкоўскай і сям'і Сянькоў зь Вялікай Брытаніі.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3417. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 17.12.2003.
Замова № 6827.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а